## Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь пацвердзіў намер развіваць адносіны з Украінай у духу стратэгічнага партнёрства

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста павіншаваў Прэзідэнта Украіны Віктара Януковіча з нацыянальным святам — Днём Незалежнасці.**

«Гэта дата стала паваротнай вяхой у гісторыі Украіны, замацавала імкненні ўкраінскага народа да нацыянальнага адраджэння, духоўнай свабоды і культурнага ўздыму», — гаворыцца ў віншаванні.

«Цвёрда перакананы, што адносіны паміж Рэспублікай Беларусь і Украінай будуць і ў далейшым развівацца ў духу стратэгічнага партнёрства, грунтуючыся на прынцыпах узаемнага даверу і падтрымкі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

## Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народнага артыста СССР Георгія Данелія з 80-годдзем

**«Вы заваявалі славу і прызнанне як выдатны рэжысёр, чыя творчасць складае цэлую эпоху ў развіцці сучаснага кінематографа», — гаворыцца ў віншаванні.**

«Беларускія гледачы добра ведаюць і высока цэняць Вашы кінастужкі, шчыра любяць незабыўныя вобразы іх герояў. Перакананы, што Вашы ўнікальны талент і шматгранная творчая дзейнасць і ў далейшым будуць садзейнічаць умацаванню сяброўства і культурных сувязяў паміж народамі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка пажадаў яму здароўя, натхнення, новых здзяйсненняў, увасаблення ў жыццё ўсіх задумаў і планаў, шчасця і дабрабыту.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Караць нельга памілаваць

# Не адзіная, але галоўная

**Прадстаўнікі еўраструктур, якія наведваюць нашу краіну, звычайна вельмі стрыманыя ў выказваннях непасрэдна ў час візітаў. Не ў прыклад іх справаздачам па вяртанні. Таму прадказваць магчымую рэакцыю — усё роўна, што варажыць на кававай гушчы. З такой жа доляй верагоднасці можна прагназаваць і вынікі бягучага візіту. Сітуацыю ў нашай краіне цяпер аналізуе дакладчык па Беларусі Камісіі ПАСЕ па палітычных пытаннях Сінікка ХУРСКАЙНЕН. Напярэдадні мы паведамлялі чытачам пра яе сустрэчы з кіраўніцтвам беларускага парламента. Учора ж спадарыня Хурскайнен пагутарыла з прадстаўнікамі няўрадавых арганізацый. Сустрэча прайшла, насуперак еўрапейскім догмам, у закрытым фармаце. Прэсу, здаецца, запрасілі, аднак далі толькі некалькі хвілін у самым пачатку — на пытанні. Ну, і на тым дзякуй... Хоць пацікавімся, якія змены ў тутэйшай сітуацыі яна назірае з часу свайго папярэдняга візіту. На пытанне «Звязды» дакладчык па Беларусі ў ПАСЕ адказвае дыпламатычна, засяродзіўшыся выключна на пазітыве:**

— Інфапункт Савета Еўропы працуе добра. Спадзяюся, журналісты маюць магчымасць яго наведваць. На ўзроўні парламента, на ўзроўні грамадства пачалося абмеркаванне смяротнай кары. Усё гэта пазітыўныя змены.

Адмена смяротнай кары ці мараторый на яе, паводле слоў спадарыні Хурскайнен, — «не адзіная, але галоўная ўмова» для вяртання Беларусі статуса спецыяльнай запрошанай у ПАСЕ.

— Ёсць яшчэ пытанні, звязаныя са свабодай СМІ, правамі чалавека, дэмакратыяй, — удакладняе прадстаўніца Фінляндыі ў ПАСЕ.

Меркаванне беларускага грамадства наконт смяротнай кары «натуральна, будзе ўлічвацца» еўрапейскім бокам, як запэўнівае С. Хурскайнен. А вось якое яно сёння, гэтае меркаванне, сказаць цяжка. Усе па звычцы спасылаюцца на вынікі рэферэндуму, дзе большасць нашых суграмадзян выказалася за выключную меру пакарання. Аднак гэта было амаль 15 гадоў таму! З таго часу шмат вады ўцякло, а галоўнае, з'явілася пажыццёвае зняволенне — чым не варыянт пакарання?..

Сама спадарыня Хурскайнен у агляднай будучыні — няхай не адзіная, але галоўная крыніца інфармацыі пра нашу краіну ў ПАСЕ. Якім будзе яе рэзюмэ? Але ж які непрадказальны нардычны характар...

**Ала МАЧАЛАВА.**

## МАЛАМАЁМНЫМ ЖЫХАРАМ МАСКОЎСКАГА РАЁНА ШТОМЕСЯЦ ВЫДАЕЦЦА НЕКАЛЬКІ СОЦЕНЬ ТАЛОНАЎ НА ЛЬГОТНЫ РАМОНТ АБУТКУ

**У сацыяльнай службе Маскоўскага раёна маламаёмным жыхарам штомесяц выдаецца 400—500 талонаў на рамонт абутку са зніжкай 35 %. Пра гэта карэспандэнту агенцтва «Мінск—Навіны» расказала выканаўца абавязкаў дырэктара ГУ «Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва» Маскоўскага раёна сталіцы Вольга Петрашэвіч. Дабрачынную дапамогу мінчанам ужо два гады аказвае прыватнае прадпрыемства ОДО «Белбытпрофі».**

Гэта не адзіны льготны тарыф на аказанне бытавых паслуг пенсіянерам і інвалідам, якія пражываюць на тэрыторыі раёна, падкрэсліла спецыяліст. Дастаўка тавараў з крамы або лекаў з аптэкі для пажылых людзей таксама ажыццяўляецца па льготных цэнах. Калі кліент — адзінокі чалавек, то паслуга яму абыходзіцца ў 590 рублёў, гэта значыць за палову тарыфу. Калі адзінокі чалавек з'яўляецца да таго ж маламаёмным, то дастаўка для яго і зусім бясплатная.

Акрамя таго, 35 адзінокіх пенсіянераў раёна штомесяц атрымліваюць талоны на гарачае харчаванне за кошт мясцовага бюджэту.

**Ніна ЯНОВІЧ, «Мінск—Навіны».**

## СУЧАСНАЯ НАРКАЛАБАРАТОРЫЯ ВЫЯЎЛЕНА Ў ШЧУЧЫНСКІМ РАЁНЕ

**Падпольная лабараторыя па вырошчванні канапель выяўлена супрацоўнікамі ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй у Шчучынскім раёне, паведаміў карэспандэнту БЕЛТА начальнік прэс-службы УУС Гродзенскага аблвыканкама Георгій Еўчар.**

Лабараторыю, абсталяваную па апошнім слове тэхнікі, стварыў у хляве свайго брата 31-гадовы жыхар вёскі Вялікае Мажэйкава Шчучынскага раёна. Непрыкметны з выгляду хлеў усярэдзіне быў абсталяваны святло-, цепла- і гукаізаляцыяй, сістэмай асвятлення з часавымі датчыкамі, кандыцыянерам, прыборамі для вымярэння вільготнасці і цяпла, рознымі фільтрамі. Усё гэта павінна было садзейнічаць добраму ўраджаю.

У момант затрымання праваахоўнікі выявілі ў хляве 36 кустоў канапель агульнай масай больш за 27 кг, а таксама гатовую да ўжывання высушаную траву.

У адносінах да затрыманага «агранома» праводзіцца комплекс мерапрыемстваў, у час якіх устанаўліваюцца ўсе задзейнічаныя ў вырошчванні і продажы канапель.

**ЗАО «РРБ-Банк» сообщает**, что 23 августа 2010 г. Правлением ЗАО «РРБ-Банк» (Протокол № 51 от 23.08.2010 г.) **утверждены изменения № 2 в Правила организации обслуживания счетов клиентов Банка** — юридических лиц и индивидуальных предпринимателей, которые вступают в силу через пять банковских дней с момента публикации.

У **суд Фрунзенскага раёна г. Мінска** паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак Малышава Алега Валер'евіча, 1972 года нараджэння, апошняе вядомае месца жыхарства якога: г. Мінск, вул. Прытыцкага, 102—282.

Просім грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Малышава Алега Валер'евіча, паведаміць іх суду Фрунзенскага раёна г. Мінска па адрасе: г. Мінск, вул. Д.-Марцінкевіча, д. 1, корп. 2, каб. 114 на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі.

Зваротная сувязь

# «НАРМАЛЬНАЯ» АБО «ШМАТДЗЕТНАЯ»?

**«Як Вы ставіцеся да шматдзетных? А чаму, увогуле, такія сем'і павінны выклікаць нейкія асаблівыя адносіны?»**

**Пра гэта журналістка «Звязды» і маці траіх дзяцей Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА разважала ў сваім матэрыяле «Абвінавачваецца шматдзетная сям'я...», які быў надрукаваны ўчора, 24 жніўня. Пакуль друкаваны нумар газеты ішоў да сваіх падпісчыкаў, на электронную версію артыкула даслала свой каментар «НАСТА», якая напісала наступнае:**

### «Не лічу сваю сям'ю шматдзетнай»

— Часта чую ад сваіх знаёмых, што, маўляў, шматдзетныя сем'і толькі ў алкаголікаў, што такіх мацярок стэрылізаваць трэба. У мяне самой два браты, ішоў я ніколечкі не шкадую, што мы расцём утрох. Па шчырасці, я нават і не ўяўляю жыццё адной ці ўдваіх з братам.

І самае цікавае, што я не лічу сям'ю, у якой трое дзетак, шматдзетнай. Гэта НАРМАЛЬНАЯ, ЗВЫЧАЙНАЯ сям'я. Таму што толькі ў такім складзе сям'я паўнавартасна можа развівацца. Дзеці са шматдзетных сем'яў, па маім досведзе, больш чулыя і клапатлівыя.

Так, праблемы будуць і ёсць у любых сем'ях, не важна, купляюць там дзецям шыкоўныя канструктары «Лега» ці абыходзяцца прасцейшымі. Паверце, мне ў дзяцінстве было больш цікава, калі мама са мной малявала. Ці калі тата на плячах нёс у старэнькі аўтобус і мы ехалі да бабулі. Сумесныя размовы пра філасофію, палітыку, сэнс жыцця і далейшую дарогу са сваімі бацькамі я не прамяняю ні на якія супермодныя рэчы. Я ўдзячная сваім бацькам за тое, што яны ў час далі зразумець, што калі я хачу новы магнітафон, то магу зарабіць на яго сваёй уласнай працай. Тады я пайшла збіраць і здаваць ягады. Я выпісвала сама любімую газету, эканомячы кішэнныя грошы. Такая самастойнасць і ўменне не здавацца ў любой сітуацыі мне часта дапамагалі ў працы. Я рана пайшла працаваць і навучылася зарабляць. У мяне цяпер не ўзнікае пытанняў, якім чынам я буду будаваць сваё дарослае жыццё пасля ўніверсітэта. Таму што мае бацькі не апекаваліся мной занадта, як гэта часта бывае ў малых сем'ях. Яны дазвалялі мне ісці сваёй дарогай, часта таму, што ў іх было яшчэ двое, і іх вольны час дзяліўся на тры. Такой увагі мне хапае для таго, каб не пачуваць сябе адзінокай, але і мець пэўную свабоду. І пасля гэтага ў мяне язык не паварочваецца сказаць, што шматдзетнасць — гэта не клопат пра дзяцей, гэта прымус іх да пастаяннай нястачы і галечы... Тут усё залежыць ад бацькоў...

А самае галоўнае ведаеце што? Калі я прыязджаю з Мінска ў сваю вёску, проста на прыпынку да мяне на шыю кідаецца васьмігадовы малодшы брат, а за ім падцягваецца чатырнаццацігадовы. Адзін выхоплівае з маіх рук сумку, другі вісіць на шыі і ніяк не хоча адпускаць. Яны балбочуць і завальваюць мяне сваімі навінамі, перабіваючы і спрачаючыся за права першаму расказаць, што котка нарадзіла трох кацянят. Што яны ездзілі купацца і бачылі буслоў, што малодшаму да школы купілі прыгожы ранец, а старэйшаму — выпускны касцюм.

А як яны радуюцца, калі я ім вязу са сталіцы розную драбязу: налепкі з футбалістамі, дыскі з гульнямі і іншае. Прамяняць гэта на адзіноту я ўжо ніколі не змагу.

### «Жывучы ў Беларусі можна мець і пяць дзяцей», —

лічыць **Вольга СУГОЙДЗЬ-ЗУБОВІЧ**.

— У нас пяцёра дзяцей: чацвёра дзяўчат і хлопец. Нядаўна мы перасяліліся ў сталічны мікраraён Сухарава, дзе жыве шмат падобных да нас сем'яў. Тым не менш, на дзіва, куды не пойдзеш — у краму ці да кіёска што купіць — усе здзіўляюцца, што шмат дзяцей. А ставяцца, трэба сказаць, добра. Нават бывала такое, што купляеш бананы, і грошай няма, каб на ўсіх, і тут прадавачка дае табе яшчэ адзін бананчык. Людзі ў нас у Беларусі вельмі добрыя, жывучы побач з такімі, можна мець пяцёра дзяцей, а можа, нават і больш. Гэта не значыць, што ёсць магчымасць за кошт чалавечай дабрыні выжываць. Я імкнуся трымацца той пазіцыі, што мне ніхто нічога не павінен. І калі я жыву з такой думкай, а мне людзі дапамагаюць, то ўдвая прыемна.

Калі ў мяне нарадзілася трэцяе дзіця, я ішла з калясачкай, суседзі ў двары, якіх я ведала толькі ў твар, пыталіся, чым мне дапамагчы, можа даць мне якое адзенне? Часта людзі проста не могуць стрымаць усмешкі, калі нас сустракаюць. Па іх адносінах бачна, што яны вельмі рады, што такое ў Беларусі яшчэ бывае. Многія ўзгадваюць: «Вось і нас у сям'і было васьмёра...»

Бывала і такое, што нам званілі ў дзверы, пакідалі веласіпед, кніжкі, і я нават не ведаю — хто. Зусім рэдка, можа, адзінкавыя былі выпадкі, калі я бачыла нейкія касыя погляды. Нічога канкрэтнага нават і не згадваецца.

У школе, калі бацькі здаюць грошы, я нешта таксама здаю, але не ўсю суму, і людзі, як правіла, ставяцца да гэтага з разуменнем. А настаўнікі кажуць нават, што можаце і не плаціць. Нехта сутыкаецца з іншым. У маёй знаёмай сямёра дзяцей, і старэйшыя вучацца ў гімназіі, дык там і слухаць не хочуць пра нейкія патуранні: нарадзіў, дык плаці як усе!

Але праблема ёсць і ў маёй сям'і. Мая старэйшая дачка, ёй 16 гадоў, у школе заўсёды баялася прызнацца, што яна са шматдзетнай сям'і. Я кажу: «Чаму? У многіх тваіх аднакласнікаў зусім няма братоў і сясцёр, а ў некаторых толькі па аднаму, яны, можа, і хацелі б мець больш, але няма».

Адзін хлопчык, калі ўбачыў, што я цяжарная, сказаў: «А мая мама таксама цяжарная!» Але гэта было не так. Яму проста вельмі хацелася брацікa альбо сястрычку. Потым, калі ў Каці з'явіўся фотаапарат, яна стала фатаграфаваць сваіх маленькіх сясцёр і паказваць іх сваім сяброўкам. Так паступова яна, спадзяюся, пазбавілася комплексу непаўнацэннасці з-за таго, што расце ў шматдзетнай сям'і. Гэты комплекс не быў выкліканы нечымі адносінамі, проста гэта было ў яе галаве.

Была праблема і ў сына. Яго аднакласнікі лічылі, што раз ён са шматдзетнай сям'і, значыць бедны. Яны зрабілі такія высновы з-за таго, што ў яго няма мабільніка. Але ў яго не было мабільніка прынцыпова, не з-за таго, што няма грошай. Проста я не хацела да 17 гадоў купляць дзецям мабільнікі, бо ёсць меркаванне, што гэта шкодна. Мне прыйшлося ўсё ж купіць мабільныя тэлефоны толькі таму, што ім далёка ездзіць у школу, і я павінна ведаць, дзе мае дзеці, бо яны ўвесь час затрымліваюцца: то ў краму зойдуць, то ў бібліятэку. Дык вось, у дзяцей сфарміравалася думка, што калі ў некага няма мабільніка і камп'ютара, значыць, ён бедны. І яны пагардліва да такога ставяцца. Але гэта было ў класе 5-м.

У 6-м дзеці проста паразумнелі і сталі ставіцца да сына як да асобы. Ён зацікавіў клас арыгамі. Адзін хлопчык заўважыў, што Міша вельмі шмат чытае, сказаў: «Ага! Ты шмат чытаеш, значыць, з табой можна сябраваць!»

Зразумела, дзеці хочуць мець тое, што маюць усе. А я не заўсёды гэта магу купіць. Тым не менш мае дзеці, думаю, не павінны адчуваць сябе беднымі і забітымі, бо ўсё, што я не магу ім купіць, у іх усё роўна з'яўляецца. Гэта прыходзіць ад людзей. Прычым я нікога ні пра што не прашу. Проста прыходзяць людзі і прыносяць тое, што трэба. Даходзіць да смешнага.

Мне неяк патрэбна было перад прыходам гасцей купіць новыя калготкі, тут прыходзіць цётка і прыносіць новыя калготкі... Нам шмат дораць хросныя бацькі. Прычым яны дапамагаюць не толькі свайму хрэсніку, але і прыносяць падарункі для астатніх.

У наш час шматдзетная сям'я не застаецца без увагі. Наш дом заселены шматдзетнымі сем'ямі: пяцёра, трое дзяцей, чацвёра. І не скажаш, што гэта дзеці бедныя, галодныя... Праблема ў тым, што калі атрымліваеш грошы, раздаеш даўгі, то грошай не застаецца. Але калі грошай не застаецца, тады ўсё прыходзіць ад людзей. Летам я вадзіла дзяцей у лагер пры праваслаўным храме. Там патрабавалі ад дзяцей, каб яны заўсёды прабівалі ў транспарце талончыкі. Я аддала апошнія грошы дачцэ, каб яна не пачувала сабе белай варонай, але сказала ёй: гэта апошнія грошы, калі не будуць пытаць, талончык не прабівай. Настаўніца пачула нашу размову. На наступны дзень я прыходжу па дачку і думаю, дзе б пазычыць 50 тысяч, каб пражыць тры дні да зарплаты. Патрэбны былі лекі для дзіцяці, яшчэ нешта. І тут падыходзіць да мяне настаўніца і дае мне 50 тысяч. І такія выпадкі не адзінкавыя. І пазычаюць людзі грошы, і так даюць. У мяне яшчэ не было такога, каб было зусім безвыходна. Многія гатовы навыварат вывернуцца, каб табе дапамагчы. У нас вельмі добрыя людзі на Беларусі!

І вось яшчэ што. Многія думаюць, што дзяржава шматдзетным вельмі дапамагае. Яны ўпэўненыя, што кватэру нам даюць бясплатна, і на ўсіх дзяцей плацяць. І вельмі здзіўляюцца, калі называеш памер зарплаты, на якую выжываем, і калі даведваюцца, што дзяржаўная дапамога ідзе толькі на адно дзіця, тое, якому няма яшчэ трох гадоў. І тады людзі хочуць, каб нам плацілі на ўсіх.

Вядома, кватэра — гэта самая галоўная дапамога. Напэўна, я проста звар'яцела б у той аднапакаёўцы, у якой мы жылі раней. І для нас новая кватэра сапраўды аказалася амаль што бясплатнай. Але жывём мы ад заробку да заробку. Па шчырасці, грошай, якія мы атрымліваем, мне хапае толькі на ежу, лекі і камунальныя паслугі. Але нездарма кажуць: Бог дае дзіця і дае на дзіця. Усё, што нам трэба, у нас ёсць.

### «Само слова «шматдзетны» мае негатыўнае адценне,» —

далучылася да размовы на старонках «Звязды» **Любоў КІШКІНА, маці двух ужо дарослых сыноў і 17-гадовай дачкі**.

— Калі людзі даведваюцца, што ты маеш гэты статус, то адчуваецца, што яны напружваюцца. Напэўна, думаюць: вось, значыць, бедны, напэўна, яму яшчэ трэба і дапамагаць!

У калектыве, у якім працую, я не адчувала да сябе пагардлівых адносінаў, можа, таму, што асабліва не акцэнтавала ўвагу на тым, што ў нас шматдзетная сям'я. Але некаторыя ставяцца да шматдзетных негатыўна. Яны кажуць: «Якая розніца — адно дзіця або трое! Усім цяжка! « Маўляў, няма чаго на гэта спасылацца. Але яны не маюць рацыі. Расход і грошай, і часу, і сіл, і здароўя з кожным дзіцем узрастае.

Але такіх людзей меншасць. Астатнім няма розніцы, колькі ў цябе дзяцей. Яны жывуць сваёй сям'ёй, сваімі справамі. Тое ж я магу сказаць пра сябе цяпер, калі ўжо не адчуваю сябе шматдзетнай маці. А перастала адчуваць не тады, калі выраслі дзеці, а калі перастала карыстацца льготамі. Калі нічога не маеш, дык якая розніца, колькі дзяцей.

Раней на працы я карысталася дадатковым свабодным днём на тыдні. Калі нарадзілася дачка, нам некаторы час давалі бясплатнае дзіцячае харчаванне, якога хапала і на астатніх дзяцей. У школе сыны мелі бясплатныя абеды, за дзіцячы садок мы плацілі ўдвая менш, як і за падручнікі — некаторы час. Вось і ўсё.

Скарыстацца льготай на кватэру мы не паспелі — старэйшы сын дасягнуў паўналецця, калі льгота была ўведзеная, і мы перасталі лічыцца шматдзетнай сям'ёй. Таму кватэрнае пытанне для мяне стаіць гэтак жа востра, як і для тых, хто мае адно альбо двое ўжо дарослых дзяцей і вымушаны жыць з імі ў адной кватэры. Па сутнасці, гэта ўжо дзве або тры сям'і на адну кухню. Дарэчы, тыя шматдзетныя, што пабудавалі з дапамогай льготнага крэдыту вялікія кватэры, сутыкнуцца з гэтай праблемай, калі дзеці вырастуць.

Самі дзеці ніколі не камплексавалі наконт таго, што яны са шматдзетнай сям'і. Наадварот, дачка ганарыцца сваімі братамі, а яны песцяць і любяць яе. Я лічу, што адно дзіця ў сям'і мае менш пераваг, чым дзіця са шматдзетнай сям'і. Чамусьці пра гэта мала кажуць і не задумваюцца, але ж браты і сёстры — гэта першая кроў. Самыя блізкія пасля бацькоў да цябе людзі. І чым іх больш, тым лягчэй жыць. Ёсць на каго абаперціся. Што б ні здарылася — і ў радасці, і ў бядзе — ты не застанешся адзін.

**Чытала каментарыі маці Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## Абзац

◢ Мінскі метрапалітэн з 1 верасня пераходзіць на зімовы графік руху электрацягнікоў. У працоўныя дні на першай лініі метро ў часы пік за гадзіну будуць праходзіць 30 пар цягнікоў замест 20, як гэта было летам. Увечары ў час пік будуць рухацца 24 пары цягнікоў за гадзіну (было 15). На другой лініі ў ранішні час пік за гадзіну будуць праходзіць 26 пар цягнікоў замест 20, у вячэрнія — 20 пар замест 15. У выхадныя дні на першай лініі падземкі ўдзень за адну гадзіну будуць праходзіць у сярэднім 15 пар цягнікоў (было 11—12), на другой лініі — 13 пар (10).

◢ **У спрэчцы 25-гадовы гамяльчанін нацкаваў на 16-гадовага хлопца свайго ратвейлера. Інцыдэнт адбыўся апоўначы ў двары аднаго з дамоў абласнога цэнтра. Дзве кампаніі маладых людзей адпачывалі па суседстве. Успыхнуў канфлікт, і 25-гадовы мужчына пайшоў дадому, адкуль вярнуўся з сабакам, якога нацкаваў на падлеткаў. У выніку адзін з іх быў шпіталізаваны. Уладальнік ратвейлера, які ў момант хуліганскай выхадкі быў нецвярозы, затрыманы. Заведзена крымінальная справа.**

◢ У Мінску з пачатку года зарэгістравана больш за 30 злачынстваў, здзейсненых ілжэсупрацоўнікамі сацыяльных і камунальных службаў. У сувязі з гэтым сталічная міліцыя напамінае, што ў большасці выпадкаў ні адна служба не накіроўвае сваіх працаўнікоў да насельніцтва без папярэдняй заяўкі. У крайнім выпадку трэба патэлефанаваць у ЖЭС ці іншую арганізацыю і высветліць, ці іх гэта супрацоўнік. Акрамя гэтага, нельга дазваляць візіцёрам хадзіць па кватэры без гаспадара.

◢ **Чорны кот стаў прычынай дарожна-транспартнага здарэння ў Лунінцы. 56-гадовы мясцовы жыхар, які ехаў на матацыкле, убачыў чорнага ката, што перабягаў дарогу. Верачы ў народную прыкмету, ён рэзка затармазіў, у выніку чаго матацыкл перакуліўся. Пенсіянер з пераломам ключыцы шпіталізаваны. Кот не пацярпеў.**

◢ Грамадзянін Малдовы меў намер дабрацца да Беларусі ў тайніку вагона пасажырскага цягніка Харкаў—Калінінград. Нелегал быў выяўлены смаргонскімі памежнікамі з дапамогай службовага сабакі ў міжстолевай прасторы пасажырскага вагона. Дакументаў у затрыманага не аказалася. Устаноўлена, што далей малады чалавек меркаваў незаконна трапіць у Літву, затым — у Партугалію «ў пошуках лепшага жыцця».

◢ **На поўначы Партугаліі адбылося буйное ДТЗ: сутыкнуліся адразу больш за 40 аўтамабіляў. У выніку аварыі загінула 5 чалавек і яшчэ 72 атрымалі раненні рознай ступені цяжкасці. Не менш як 24 пацярпелыя, шпіталізаваныя з месца ДТЗ, знаходзяцца ў цяжкім стане, паведамляюць інфармагенцтвы. Як мяркуецца, інцыдэнт адбыўся з-за дрэнных умоў надвор'я. 23 жніўня ў гэтым рэгіёне прайшоў дождж і бачнасць на дарозе пагоршылася з-за туману. У эвакуацыі параненых і тушэнні пажару было задзейнічана каля 200 ратавальнікаў і пажарных. На месца здарэння вылецелі 3 верталёты.**

◢ Шэсць грамадзян Малдовы загінулі ўчора ў выніку страшнага ДТЗ, якое адбылося ў Венгрыі, непадалёк ад румынскай мяжы. Яшчэ тры чалавекі атрымалі траўмы, адзін з іх знаходзіцца ў цяжкім стане. ДТЗ адбылося з-за таго, што грузавік з румынскімі рэгістрацыйнымі нумарамі выехаў на паласу сустрэчнага руху і сутыкнуўся з мікрааўтобусам, на якім малдаўскія грамадзяне вярталіся з Італіі.

### Поўны абзац



◢ **Казёл выгнаў нямецкіх будаўнікоў з кватэры, якую яны рамантавалі. Будаўнікі паскардзіліся ў паліцыю на жывёліну, што прагнала іх з працы. Інцыдэнт адбыўся ў горадзе Офенбург. Атрымаўшы скаргу, спачатку вырашылі, што рабочыя спрабуюць іх разыграць, аднак, прыехаўшы на месца выкліку, убачылі, што ў шматкватэрным доме на 3-ім паверсе сапраўды пасяліўся буйны казёл. У якасці ежы ён выкарыстоўваў фіранкі, што віселі на вокнах. «Мы не ведаем, як казёл узняўся на трэці паверх і як ён увайшоў у кватэру. Мы таксама не можам сказаць, каму належыць жывёліна, бо не атрымлівалі ніякіх звестак аб прапажы казла», — патлумачылі ў паліцыі. З кватэры казла дапамог вывесці мясцовы фермер, які часова прытуліў казла ў сябе. Як толькі аб'явяцца гаспадары, жывёліну ім вернуць.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## У БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ ВЫЯЎЛЕНЫ ФАКТЫ ПАРУШЭННЯ ПАРАДКУ МЕДЫЦЫНСКАГА АГЛЯДУ НА ПРАДМЕТ АП'ЯНЕННЯ

**Пракуратурай Брэсцкай вобласці выяўлены парушэнні заканадаўства аб парадку правядзення медыцынскага агляду грамадзян на прадмет устанаўлення стану ап'янення, паведамілі БЕЛТА ў Генпракуратуры.**

У ходзе праверкі пракуратурай выяўлены факты парушэнняў правіл забору, захоўвання і перадачы біяасяроддзяў, устаноўлены факты невыканання зацверджанай Міністэрствам аховы здароўя формы пры афармленні пратаколаў агляду.

За апошні час узрасла і колькасць скаргаў з боку грамадзян на вынікі медыцынскіх аглядаў. Прычым кожная чацвёртая скарга задаволена абласной урачэбна-кантрольнай камісіяй па медыцынскім аглядзе.

У асобных выпадках неналежнае выкананне медработнікамі службовых абавязкаў дало магчымасць грамадзянам пазбегнуць адказнасці. Так, адзін з жыхароў Іванаўскага раёна не быў прыцягнуты да адказнасці судом за кіраванне транспартным сродкам у стане алкагольнага ап'янення ў сувязі з недаказанасцю, паколькі ўрач Іванаўскай раённай бальніцы вынес два супрацьлеглыя заключэнні. Першапачаткова ім быў устаноўлены факт знаходжання грамадзяніна ў стане алкагольнага ап'янення, а праз 40 хвілін, пасля паўторнага агляду, урач прыйшоў да высновы, што грамадзянін цвярозы.

Па фактах парушэнняў пракуратурай вобласці ўнесена прадстаўленне начальніку ўпраўлення аховы здароўя Брэсцкага аблвыканкама. Па патрабаванні пракуратуры да дысцыплінарнай адказнасці прыцягнуты 13 работнікаў медустаноў вобласці, у прыватнасці галоўныя ўрачы Драгічынскай, Кобрынскай, Камянецкай і Маларыцкай цэнтральных раённых бальніц. Галоўным урачам Жабінкаўскай і Пружанскай ЦРБ зніжаны памеры прэміяльных даплат.

У Генпракуратуры таксама адзначылі, што за апошнія гады ў вобласці значна павялічылася колькасць медыцынскіх аглядаў па ўстанаўленні фактаў ужывання алкаголю, наркатычных, таксікаманічных сродкаў і ступені стану ап'янення. У мінулым годзе іх было праведзена больш за 60 тыс. — на 20 тыс. больш, чым у 2006 годзе.

## СТАЛІЧНЫЯ ХЛЕБАЗАВОДЫ ЗА СТУДЗЕНЬ—ЛІПЕНЬ АБНАВІЛІ АСАРТЫМЕНТ ПРАДУКЦЫІ НАПАЛОВУ

**Мінскі хлебазавод № 2 асвоіў вытворчасць набору хлябоў «Нарачанскія кроплі». Гэта заварныя хлябы, што вырабляюцца па чатырох рэцэптах у спецыяльнай форме па 90 г. Хлебазавод № 4 распрацаваў хлеб «Вясковы з салам».**

Акрамя таго, развіваецца так званая еўрапейская лінейка прадукцыі — хлябы «Варшаўскі», «Польскі», што вырабляюцца па паскоранай тэхналогіі з прымяненнем дабавак. Пашыраецца група дыетычных, у тым ліку дыябетычных хлябоў — з'явіліся «Геркулес», «Англійскі зерневы» і «Аўсянік».

На сталічным хлебазаводзе № 5 сёлета пачнуць выпускаць замарожаныя тарты. На прадпрыемстве было прынята прынцыповае рашэнне не прымяняць для ржанога і ржана-пшанічнага хлеба масавай вытворчасці ніякіх дабавак: кансервантаў, паляпшальнікаў, эмульгатараў. У Дзяржстандарце атрыманы сертыфікат «Натуральны прадукт» на сем відаў хлеба: «Сітны» асобы, «Сітны» заварны, «Жытніца», «Майскі», «Майскі» аматарскі, «Кубанскі», «Спадчына» традыцыйны.

**Вераніка ЛЕБЕДЗЕВА, «Мінск—Навіны».**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

### МГ УКП «Центр по приватизации» проводит открытый аукцион 27 сентября 2010 г. по продаже оборудования, находящегося на балансе ОАО «Могилевхимволокно»

| № лота | Наименование | Начальная цена продажи (без учета НДС), руб. | Сумма задатка, руб. | Характеристика объекта |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Установка получения нетканого полотна № 1 (инв. № 4490088500) | 84 196 030 | 8 419 000 | Установки получения нетканого полотна введены в эксплуатацию в 1988 году. Установленная мощность – 156 кВт. Длина 20-22 м, ширина – 3,5 м, максимальная ширина выпускаемого полотна 260-263 см. Установка получения нетканого полотна предназначена для разрыхления волокна, получения холста, иглопробивания холста и формирования полученного нетканого полотна в рулоны. Техническая документация на установки получения нетканого полотна отсутствует. |
| 2 | Установка получения нетканого полотна № 2 (инв. № 4490088600) | 84 196 030 | 8 419 000 | |

**Аукцион состоится «27» сентября 2010 года в 15.00 в зале заседаний Могилевского городского исполнительного комитета по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а.**

Организатор аукциона: МГ УКП «Центр по приватизации», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 28а.

Продавец: ОАО «Химволокно», г. Могилев-35.

Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, представить в МГ УКП «Центр по приватизации» следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

подписанное с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон;

копию платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на расчетный счет МГ УКП «Центр по приватизации» 3012213290010 в ГФ по Могилевской области ОАО «Белинвестбанк», МФО 153801712, УНН 700008710, последний день внесения задатка «23» сентября 2010 г.

**юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь:**

копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица;

доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя;

**юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь:**

легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть получена не ранее 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя;

**индивидуальным предпринимателям:**

копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя;

доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя;

**физическим лицам – гражданам Республики Беларусь, физическим лицам – иностранным гражданам:** документ, удостоверяющий личность.

Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену.

В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником аукциона, предмет торгов по решению аукционной комиссии продается этому лицу при его согласии (далее – лицо, приравненное к победителю аукциона) по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

До подписания договора купли-продажи победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней, не считая дня проведения аукциона, обязан в соответствии со счетом-фактурой возместить организатору аукциона фактические затраты на его организацию и проведение. Договор купли-продажи заключается Продавцом и победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение 10 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона.

Оплата стоимости приобретенного на аукционе предмета торгов осуществляется победителем (лицом, приравненным к победителю) аукциона в белорусских рублях в установленном порядке.

Условия оплаты – разовый платеж.

С объектами можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни недели с 8 до 17 часов.

Заявки принимаются ежедневно с 26 августа 2010 в рабочие дни с 8 до 17 часов по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 411. **Последний день приема заявок – «23» сентября 2010 года.** Заключительная регистрация участников аукциона «27» сентября 2010 года с 14 до 15 часов.

**Контактные телефоны: г. Могилев (0222) 22 21 78, 22 00 89.**

## Управляющий по делу о банкротстве ЧУП «Автодом-Запад» Монтик Д.Н. – организатор торгов сообщает о проведении ТОРГОВ по продаже транспортных средств ЧУП «Автодом-Запад», а именно:

| № лота | Наименование лота | Количество | Начальная цена продажи лота, бел. руб. (с НДС) | Шаг торгов, бел. руб. (5 % от начальной цены) | Задаток, бел. руб. (5 % от начальной цены) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Полуприцеп КЕГЕЛЬ SFHB 24, 2005 г.в. | 1 | 48 938 352 | 2 446 918 | 2 446 918 |
| 2 | Полуприцеп ШМИТЦ SPR24, 2007 г.в. | 1 | 61 819 776 | 3 090 989 | 3 090 989 |
| 3 | Седельный тягач ВОЛЬВО FH12, 2003 г.в. | 1 | 114 430 428 | 5 721 521 | 5 721 521 |
| 4 | Полуприцеп ШМИТЦ S01, 2004 г.в. | 1 | 48 175 632 | 2 408 782 | 2 408 782 |
| 5 | Полуприцеп ШМИТЦ SPR24, 2004 г.в. | 1 | 48 649 884 | 2 432 494 | 2 432 494 |
| 6 | Седельный тягач ДАФ 95XF, 2004 г.в. | 1 | 118 180 236 | 5 909 012 | 5 909 012 |
| 7 | Седельный тягач МАН TGA 18.410, 2004 г.в. | 1 | 122 726 712 | 6 136 336 | 6 136 336 |
| 8 | Седельный тягач МАН TGA 18.410, 2004 г.в. | 1 | 128 247 900 | 6 412 395 | 6 412 395 |
| 9 | Полуприцеп ШМИТЦ S01, 2004 г.в. | 1 | 46 634 328 | 2 331 716 | 2 331 716 |

Торги проводятся в форме аукциона, открытого по составу участников и по форме подачи предложений о цене.

**Торги состоятся 28 сентября 2010 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Солнечная, 5.**

До подачи заявки Претенденту необходимо перечислить задаток в безналичном порядке по следующим платежным реквизитам: ЧУП «Автодом-Запад», р/с 3012000001027 в филиале № 6 ОАО «Белгазпромбанк» г. Гродно, код 194, УНП 590662206.

Заявления на участие в аукционе с приложением платежного поручения, подтверждающего внесение задатка, а также: для юридических лиц – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации, устава; для индивидуального предпринимателя – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копии паспорта, принимаются с момента выхода настоящего объявления до 12.00 27.09.2010 по адресу: 230001, г. Гродно, ул. Солнечная, 5 или по факсу: 8(0152)526859.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 дней после подписания протокола.

Иную информацию о порядке и условиях проведения торгов, ознакомлении с предметом торгов можно получить в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Гродно, ул. Солнечная, 5, тел. 8(029)6309211, тел./факс 8(0152)526859.

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
25 ЖНІЎНЯ 2010 г. СЕРАДА № 31 (15634)

# УВАГА! ДЗЕЦІ!

**ВОСЬ і падышлі да завяршэння летнія канікулы. Усяго некалькі дзён аддзяляюць навучэнцаў ад школы. З адпачынку ў гарады вяртаюцца дзеці. Некаторыя з іх канікулы правялі ў бабуль-дзядуль у вёсцы, нехта ездзіў на адпачынак за межы краіны. І пытанні выканання правілаў дарожнага руху на час адышлі на другі план. А гэта значыць, што цяпер трэба нагадаць дзецям, як правільна паводзіць сябе на дарозе.**

**Як адзначыў начальнік аддзела навукова-метадычнага і прававога забеспячэння ўпраўлення дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі Міністэрства ўнутраных спраў Анатоль СУШКО, з пачатку года 19 дзяцей загінулі ў краіне пад коламі аўто, 318 траўмаваны.**



— У параўнанні з мінулым годам адзначаецца скарачэнне колькасці загінулых і траўмаваных дзяцей пад коламі аўтамабіляў, — адзначае Анатоль Сушко. — Гэта значыць, што ўжо назіраецца станоўчы эфект ад прафілактычнай работы, якая праводзіцца ў краіне. Разам з тым, сам факт таго, што дзеці гінуць на дарозе, сумны. Мне хацелася б звярнуцца да бацькоў. У сітуацыі, калі ўжо вядомая школа, куды пойдзе вучыцца дзіця (асабліва гэта датычыцца першакласнікаў), было б добра, каб бацькі спачатку самі прайшлі па маршруце ад дома да школы і ацанілі яго. Спачатку кароткі маршрут, наколькі ён бяспечны. А можа, крыху даўжэйшы будзе больш бяспечным. Не трэба цягнуць соннае дзіця ў школу, спяшаючыся на працу. Лепш прачнуцца раней, спакойна разам з ім прайсці да школы і пры гэтым тлумачыць яму, як сябе трэба паводзіць на дарозе, дзе лепш яе перайсці. Так у школьніка выпрацуецца яго першы самастойны маршрут да навучальнай установы і назад: бо калі раніцай дзіця вядуць у школу па правілах, а ўвечары не, ці наадварот, у дзіцяці нічога не адкладзецца.

**На самай справе менавіта дарослыя нясуць адказнасць за жыцці дзяцей. Нярэдка ў дарожна-транспартныя здарэнні трапляюць дзеці-пасажыры. Старшы інспектар упраўлення дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі Міністэрства ўнутраных спраў Станіслаў САЛАВЕЙ прывёў прыклад, калі на мінулым тыдні ўначы адна сям'я на машыне вярталася з адпачынку з Крыма. У машыне з дарослымі знаходзілася сямігадовая дзяўчынка. Бацька малой — майстар вытворчага навучання ваджэнню — пераацаніў свае сілы, заснуў за рулём, машына перакулілася і трапіла ў кювет. У выніку дзяўчынка загінула. Часам дарослыя, перавозячы ў аўто дзяцей, забываюцца пра тое, якая дадатковая адказнасць кладзецца на іх плечы. А наступствы такой халатнасці, на жаль, вельмі сумныя. З 23 жніўня па 8 верасня ў краіне праходзіць комплекс спецыяльных мерапрыемстваў «Увага! Дзеці!», накіраваных на прафілактыку дарожных здарэнняў з удзелам школьнікаў.**

— На працягу гэтых дзён, — заўважыў Станіслаў Салавей, — запланаваны самыя розныя акцыі, выступленні ў навучальных установах і працоўных калектывах. Таксама хацелася б парэкамендаваць вадзіцелям у гэты перыяд нават у светлы час сутак уключаць блізкае святло фар. Збіраючы дзіця ў школу, неабходна звярнуць увагу на тое, ці ёсць у яго на адзенні і заплечніку святлоадбівальныя элементы. Таксама гэтымі днямі пройдзе акцыя «Бяспечны пераход», калі на пешаходным пераходзе будуць дзяжурыць зацікаўленыя асобы, будзем прыцягваць і саміх школьнікаў. Чаму менавіта ў гэты час мы праводзім такія спецыяльныя мерапрыемствы? Многія дзеці прыязджаюць у горад з вёсак, і трэба падрыхтаваць іх да ўмоў горада. Яшчэ адна важная катэгорыя — дзеці-падлеткі, якія, пачынаючы з 7-8-9 класаў, ужо садзяцца за руль скутара, матацыкла ці аўто. Як вынік — дарожнае здарэнне. І тут, вядома, вінаватыя бацькі, якія пакідаюць без нагляду ключы, што і становіцца прычынай трагедыі.

**Як паказвае статыстыка, з кожным годам колькасць дзяцей, якія гінуць на дарозе, змяншаецца. Разам з тым, па словах галоўнага інспектара ўпраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Уладзіміра ПАДДУБСКАГА, гэтая работа не можа лічыцца выкананай, калі пад коламі аўто гіне хоць адно дзіця. І не мае розніцы, па чыёй віне: сваёй ці бацькоў.**

— З мінулага года ў школах, — адзначыў ён, — з 2 па 9-ты клас вывучаецца курс «Асновы бяспекі жыццядзейнасці». З гэтага года павялічваецца колькасць гадзін курса. Таксама ў дашкольных установах рэалізуецца адукацыйная праграма «Пралеска». У дзіцячых садках абсталяваны спецыяльныя пляцоўкі, дзіцячыя гарадкі, дзе можна трэніраваць дзяцей, як паводзіць сябе на дарозе. Праўда, пакуль не ва ўсіх садках гэтыя гарадкі належнай якасці. Аднак на гэта звяртаецца пільная ўвага. Да таго ж, сёлета для навучэнцаў 5—6-х класаў арганізаваны факультатыўны курс «Бяспечны веласіпед», падчас якога будуць выкладацца прынцыпы бяспечнага кіравання і паводзіны на дарогах у сельскіх і гарадскіх умовах. А для старэйшых класаў распрацоўваецца аналагічны курс заняткаў «Матацыкліст».

**Акрамя таго, як адзначыў Уладзімір Паддубскі, зараз у краіне распрацоўваецца комплексная праграма па бяспецы на дарогах на 2011—2015 гады. Разам з тым, ні якая прафілактычная работа не будзе мець вялікага эфекту, калі ў сям'і на гэта не звяртаюць належнай увагі. Усё пачынаецца з сям'і. І калі бацькі дазваляюць сабе пераходзіць дарогу ў неналежным месцы і на чырвоны сігнал святлафора, не трэба чакаць, што іх дзеці будуць дакладна выконваць правілы дарожнага руху. І яшчэ: дарослым трэба паклапаціцца, каб на ранцы школьніка і на вопратцы абавязкова быў флікер. Усё гэта дапаможа захаваць жыцці дзяцей на дарозе.**

**Святлана СУХАРКО.**

Яўгенія НЯРОНСКАЯ:

# «МІС МАКСІМ» Я СТАЛА ПАСЛЯ ЎДЗЕЛУ Ў КОНКУРСЕ «МІС БЕЛАРУСЬ»

**Штосьці ў ёй ёсць ад імператара Нерона. Не жорсткасць, не. Мэтанакіраванасць і настойлівасць. Бо як яшчэ патлумачыць, што ў свае 23 дзяўчына ўжо тройчы ўдзельнічала ў кастынгах «Міс Беларусь»? У 2006-м яна дайшла да фіналу, але для кароны пераможцы была яшчэ зусім юнай. Да 2008-га прыгажуня Няронская скончыла мадэльную школу і нават атрымала гучны тытул «Міс Фота» на міжнародным конкурсе «Міс Універсітэт-2007». Але... на «Міс Беларусь» дзяўчыну не ўзялі. Арганізатары не ведалі, што менавіта гэтая брунэтка ў будучыні заваюе для Беларусі тытул трэцяй віцэ-міс на конкурсе «Турызм Інтэркантыненталь» і будзе аб'яўленая дзяўчынай года па версіі глянцавага часопіса для мужчын «Максім». Як і не ведала сама Жэня.**

**Асабістая справа:** Яўгенія Няронская. Нарадзілася ў Мінску ў 1986 годзе. Прафесійная мадэль. Працуе ў маскоўскім мадэльным агенцтве «President Model Management». Выпускніца Інстытута журналістыкі БДУ (2010) па спецыяльнасці «Журналістыка. Аўдыёвізуальныя СМІ». Уладальніца тытула «Міс фота» на конкурсе «Міс Універсітэт» (2007, Карэя), тытула «Міс Максім» (2008, Расія), тытула трэцяй віцэ-міс на конкурсе «Турызм Інтэркантыненталь» (2010, Малайзія). Да паступлення на факультэт журналістыкі некаторы час працавала прэс-сакратаром камітэта па драйгрэсінгу Беларускай аўтамабільнай федэрацыі.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

(Працяг на 2-й стар. «ЧЗ».)

ДЕПАРТАМЕНТ
ПО ЦЕННЫМ БУМАГАМ
Министерства финансов
Республики Беларусь
**ЗАВЕРЕНО**
«16» августа 2010 г.
___________ Гальперин А.Л.

белагропромбанк
традиции будущего

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

## об открытой продаже облигаций открытого акционерного общества «Белагропромбанк» для юридических лиц семьдесят пятого выпуска

**1. Наименование эмитента:**

открытое акционерное общество «Белагропромбанк» (ОАО «Белагропромбанк»)

адкрытае акцыянернае таварыства «Белаграпрамбанк» (ААТ «Белаграпрамбанк»).

**2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)**

Местонахождение Банка: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3.
Телефон: (017) 229 63 26, факс (017) 229 64 43
Электронный адрес E-mail: info@belapb.by
УНП 100693551, ОКПО 00040577.

**3. Сумма зарегистрированного уставного фонда**

Уставный фонд Банка составляет 4 003 635 046 000 бел. рублей.

**4. Наименование периодического печатного издания, в котором ежегодно будет публиковаться бухгалтерский баланс, отчет о прибыли и убытках, и сроки их публикации**

Бухгалтерский баланс и отчет о прибыли и убытках ОАО «Белагропромбанк» ежегодно будет публиковаться в газете «Звязда» не позднее 25 апреля года, следующего за отчетным.

Бухгалтерский баланс на 1 января 2010 года и отчет о прибыли и убытках за 2009 год ОАО «Белагропромбанк» опубликованы 30.03.2010 в газетах «Звязда» и «Рэспубліка».

**5. Депозитарием, обслуживающим Банк,** является Депозитарий ценных бумаг Банка, расположенный по адресу: 220036, г.Минск, пр-т Жукова, 3, действующий на основании специального разрешения (лицензии) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, регистрационный номер 02200/0385593, срок действия лицензии до 18.07.2012.

**6. Дата, номер государственной регистрации Банка и наименование органа, его зарегистрировавшего**

Банк преобразован из Белорусского республиканского банка Агропромбанк СССР учредительной конференцией 11.02.1991 и зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 03.09.1991, регистрационный №20. Устав Банка утвержден общим собранием акционеров 11.02.1991 (протокол №1).

Банк в своей деятельности руководствуется законодательством Республики Беларусь, международными договорами Республики Беларусь, локальными нормативными правовыми актами Банка, а также Уставом Банка.

**7. Сведения о проведении открытой продажи облигаций семьдесят пятого выпуска**

**7.1. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение**

Решение о выпуске именных облигаций семьдесят пятого выпуска для юридических лиц в соответствии с Уставом Банка утверждено Наблюдательным советом Банка 03.08.2010, протокол №23.

**7.2. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество и вид облигаций**

Форма выпуска облигаций – бездокументарные.

Объем эмиссии облигаций составляет 60 000 000 000 (Шестьдесят миллиардов) белорусских рублей.

К открытой продаже предлагаются 60 000 (Шестьдесят тысяч) штук процентных облигаций.

Серия ОБ75, номера 000001 – 060000.

Вид облигаций – процентные, именные, неконвертируемые.

**7.3. Номинальная стоимость облигации**

Номинальная стоимость облигации – 1 000 000 (Один миллион) белорусских рублей.

**7.4. Цель выпуска облигаций**

Семьдесят пятый выпуск облигаций Банка осуществляется в целях привлечения временно свободных денежных средств юридических лиц для финансирования реального сектора экономики.

**7.5. Выпуск облигаций согласован Национальным банком Республики Беларусь** (постановление Правления Национального банка Республики Беларусь от 12.08.2010 №343)

**7.6. Период проведения открытой продажи облигаций**

Размещение облигаций осуществляется с 30.08.2010 по 29.04.2011 включительно, если больший срок не будет определен Правлением Банка. Срок открытой продажи может быть сокращен в случае полной реализации всего объема эмиссии облигаций.

**7.7. Место и время проведения открытой продажи облигаций**

Первичное размещение (продажа) облигаций Банка производится после согласования с Национальным Банком Республики Беларусь выпуска именных облигаций, регистрации в Департаменте по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь выпуска именных облигаций, опубликования заверенной Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь краткой информации об открытой продаже именных облигаций семьдесят пятого выпуска.

Первичное размещение облигаций осуществляется на внебиржевом рынке путем открытой их продажи в филиалах, отделениях, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка в течение их рабочего времени до момента полной реализации всего объема эмиссии облигаций.

В случае размещения облигаций семьдесят пятого выпуска не в полном объеме, Банк вправе досрочно погасить часть выпуска облигаций до даты окончания срока обращения данного выпуска в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Владельцами облигаций могут быть только юридические лица. Юридические лица, изъявившие желание приобрести облигации, обязаны перечислить денежные средства в безналичном порядке с текущих (расчетных) счетов на счет Банка, указанный в договоре.

Продажа облигаций осуществляется по текущей стоимости, рассчитываемой по формуле:

$$С = Н + Дн,$$

где:
С – текущая стоимость облигации;
Н – номинальная стоимость облигации,
Дн – накопленный процентный доход.

В день начала открытой продажи облигаций, а также в день выплаты процентного дохода текущая стоимость облигации равна ее номинальной стоимости.

Начиная со второго дня открытой продажи, покупатель также уплачивает сумму накопленного процентного дохода, рассчитываемую по следующей формуле:

$$Дн = (П1*Н*Т1 + П2*Н*Т2 + …. + Пn*Н*Тn) / (365*100),$$

где:
Дн – накопленный процентный доход;
Н – номинальная стоимость облигации;
П1, П2, Пn – ставка процентного дохода (процентов годовых) за соответствующую часть периода начисления дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной, равная действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 0,5 (Ноль целых пять десятых) процентных пункта;
Т1, Т2, Тn – количество дней соответствующей части периода начисления дохода, в пределах которой ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной. При этом сумма Т1 + Т2 +….+ Тn должна быть равна количеству дней в соответствующем периоде начисления дохода.

Расчет осуществляется по каждой облигации, исходя из фактического количества дней в году (365).

**7.8. Срок и порядок обращения облигаций**

Срок обращения облигаций – 365 календарных дней с 30.08.2010 по 30.08.2011. День начала размещения облигаций и день начала погашения облигаций считаются одним днем.

Совершение сделок купли-продажи облигаций при их обращении осуществляется юридическими лицами на внебиржевом рынке с заключением договора купли-продажи и (или) биржевом рынке в соответствии с порядком, установленным ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».

Сделки с облигациями на вторичном рынке прекращаются за три рабочих дня:
- до даты выплаты процентного дохода за каждый период начисления дохода в течение всего срока обращения облигаций;
- до даты погашения облигаций.

**7.9. Дата начала погашения облигаций**

Дата погашения облигаций – 30.08.2011.

**7.10. Порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты**

Выплата дохода по облигациям производится в виде процентного дохода 1 раз в 3 месяца в соответствии с графиком выплаты дохода на основании реестра владельцев облигаций путем перечисления в безналичном порядке суммы процентного дохода на счет владельцев облигаций в белорусских рублях. Реестр владельцев облигаций составляется на дату, предшествующую трем рабочим дням дате выплаты процентного дохода за соответствующий период начисления дохода.

График выплаты процентного дохода по облигациям

| Порядковый номер периода начисления дохода | Начало периода | Конец периода, дата выплаты дохода | Продолжительность периода (дней) |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| 1 | 30.08.2010 | 30.11.2010 | 92 |
| 2 | 01.12.2010 | 28.02.2011 | 90 |
| 3 | 01.03.2011 | 31.05.2011 | 92 |
| 4 | 01.06.2011 | 30.08.2011 | 91 |
| ИТОГО: | х | х | 365 |

В случае, если дата выплаты процентного дохода выпадает на нерабочий день, выплата процентного дохода осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим. Проценты на сумму процентного дохода по облигациям за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются. Под нерабочими днями в настоящем решении понимаются выходные дни, государственные праздники и праздничные дни, являющиеся нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Процентный доход по процентным облигациям за первый период начисления дохода начисляется с даты, следующей за датой начала размещения облигаций по дату его выплаты включительно. День начала размещения облигаций и день выплаты дохода за первый период начисления дохода считаются одним днем.

Процентный доход по процентным облигациям за последующие периоды начисления дохода начисляется с даты, следующей за датой выплаты дохода за предшествующий период начисления дохода по дату выплаты дохода за соответствующий период начисления дохода (дату погашения). День выплаты дохода за предшествующий период начисления дохода и день выплаты дохода за текущий период начисления дохода (дата погашения) считаются одним днем.

Начисление процентного дохода осуществляется в течение срока обращения облигаций. Со дня истечения срока обращения облигаций процентный доход не начисляется.

Расчет процентного дохода производится путем его начисления на номинал облигации за период начисления дохода по процентной ставке, равной действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь с учетом ее изменения плюс 0,5 (Ноль целых пять десятых) процентных пункта.

Расчет процентного дохода осуществляется по следующей формуле:

$$Д = (П1*Н*Т1 + П2*Н*Т2 + …. + Пn*Н*Тn) / (365*100),$$

где:
Д – процентный доход;
П1, П2, Пn – ставка процентного дохода (процентов годовых) за соответствующую часть периода начисления дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной, равная действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 0,5 (Ноль целых пять десятых) процентных пункта;
Н – номинальная стоимость облигации;
Т1, Т2, Тn – количество дней соответствующей части периода начисления дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной. При этом сумма Т1 + Т2 +….+ Тn должна быть равна количеству дней в соответствующем периоде начисления дохода.

Расчет процентного дохода осуществляется по каждой облигации, исходя из фактического количества дней в году (365).

В случае отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о банковских реквизитах владельцев облигаций (не представления владельцами облигаций измененных данных о банковских реквизитах), не переоформления счетов «депо» на новых владельцев в соответствии с законодательством Республики Беларусь, а также в иных случаях, установленных законодательством Республики Беларусь, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на соответствующем счете Банка до непосредственного обращения владельцев облигаций (уполномоченных лиц). Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.

При обращении владельцы облигаций представляют в Банк письменные заявления с указанием новых (измененных) банковских реквизитов, которые могут быть переданы нарочным (курьером) и (или) с использованием факсимильной связи с последующим обязательным представлением оригиналов заявлений на бумажном носителе. При необходимости переоформления счетов «депо», открытых в депозитарии Банка, владельцы облигаций обязаны предоставить документы, предусмотренные законодательством Республики Беларусь.

Выплата причитающейся владельцам облигаций суммы производится не позднее 1 (Одного) рабочего дня после представления Депозитарию ценных бумаг Банка необходимых документов.

Облигации предоставляют владельцу право на получение процентного дохода, а также номинальной стоимости облигаций при их погашении в денежных единицах, в которых выражена их номинальная стоимость. Процентный доход выплачивается только за полностью истекшие периоды начисления дохода.

**7.11. Условия и порядок досрочного погашения облигаций**

Досрочное погашение облигаций не производится.

**7.12. Порядок погашения облигаций**

Погашение облигаций производится 30.08.2011 на основании реестра владельцев облигаций. В случае, если дата погашения выпадает на нерабочий день, погашение осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем по цене равной номинальной стоимости облигации. Проценты на сумму погашения в указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.

В случае отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о банковских реквизитах владельцев облигаций (не представления владельцами облигаций измененных данных о банковских реквизитах), не переоформления счетов «депо» на новых владельцев в соответствии с законодательством Республики Беларусь, а также в иных случаях, установленных законодательством Республики Беларусь, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на соответствующем счете Банка до непосредственного обращения владельцев облигаций (уполномоченных лиц). Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.

При обращении владельцы облигаций представляют в Банк письменные заявления с указанием новых (измененных) банковских реквизитов, которые могут быть переданы нарочным (курьером) и (или) с использованием факсимильной связи с последующим обязательным представлением оригиналов заявлений на бумажном носителе. При необходимости переоформления счетов «депо», открытых в депозитарии Банка, владельцы облигаций обязаны предоставить документы, предусмотренные законодательством Республики Беларусь.

Выплата причитающейся владельцам облигаций суммы производится не позднее 1 (Одного) рабочего дня после представления Депозитарию ценных бумаг Банка необходимых документов.

При погашении облигации владельцу выплачивается в безналичном порядке номинальная стоимость облигаций, а также процентный доход.

**7.13. Дата формирования реестра владельцев облигаций для целей погашения облигаций**

Реестр владельцев облигаций составляется на дату, предшествующую трем рабочим дням дате погашения облигаций (по состоянию на 25.08.2011).

**7.14. Условия и порядок приобретения облигаций эмитентом до даты начала их погашения**

В период обращения облигаций Банк может осуществлять выкуп облигаций у любого их владельца в следующие даты: 20.12.2010, 20.04.2011. Выкуп облигаций осуществляется Банком на внебиржевом рынке на основании договора купли-продажи, заключенного между владельцем облигации и Банком, по текущей стоимости на дату выкупа.

В случае если день выкупа выпадает на нерабочий день, выкуп осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем по цене, приходящейся на дату выкупа. Проценты на сумму облигаций, выкупаемых Банком, за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.

Для продажи облигаций Банку владелец облигаций должен:

1. Не позднее пяти рабочих дней до даты выкупа предоставить в Банк заявление о намерении осуществить такую продажу, которое должно содержать:
- наименование владельца облигаций;
- наименование ценной бумаги;
- количество облигаций, предложенных для продажи;
- согласие с условиями приобретения облигаций Банком, которые изложены в настоящем Решении;
- юридический адрес (место нахождения) и контактные телефоны заявителя;
- подпись уполномоченного лица и печать заявителя – юридического лица.

2. Не позднее одного рабочего дня до даты выкупа:
- перевести указанные в заявлении облигации со счета «депо» заявителя – юридического лица на счет «депо» ОАО «Белагропромбанк» в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи.
- при необходимости предоставить в Банк карточку с образцами подписей, заверенную в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

В случае несоблюдения сроков предоставления заявления о выкупе и (или) перевода указанных в заявлении облигаций на соответствующий счет «депо» ОАО «Белагропромбанк» выкуп облигаций не осуществляется.

Банк имеет право осуществлять:
- продажу приобретенных облигаций Банка по текущей стоимости;
- иные действия с приобретенными облигациями Банка в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**7.15. Дата и номер государственной регистрации облигаций**

Облигации семьдесят пятого выпуска зарегистрированы в Департаменте по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 16.08.2010, регистрационный номер 5-200-02-0720.

**8. Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрете выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь**

В случае запрета выпуска облигаций Банк в месячный срок с момента принятия такого решения Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь возвращает владельцу облигаций денежные средства, полученные в счет оплаты облигаций с уплатой процентов за пользование денежными средствами по ставке процентного дохода, равной ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь с учетом ее изменения плюс 0,5 (Ноль целых пять десятых) процентных пункта за текущий период начисления дохода, в котором принято решение о запрете выпуска облигаций.

**9. Информация об обеспечении облигаций: состав и стоимость имущества, выступающего в качестве залога, основная сумма долга по кредитам, выданным банком на строительство, реконструкцию или приобретение жилья под залог недвижимости (жилищное строительство), сведения о поручительстве, банковской гарантии**

Выпуск облигаций осуществляется без обеспечения по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь при условии, что общий размер обязательств по таким облигациям не превышает 80 процентов нормативного капитала Банка (подпункт 1.8 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28.04.2006 №277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг».

По состоянию на 01.07.2010 нормативный капитал Банка составляет 4 566 831,5 млн. бел. рублей.

**10. Место, время и способ ознакомления с более подробной информацией (проспектом эмиссии облигаций)**

С более подробной информацией (проспектом эмиссии облигаций) можно ознакомиться в филиалах, отделениях, а также ОПЕРУ центрального аппарата ОАО «Белагропромбанк» в течение их рабочего времени.

Адреса филиалов банка ОАО «Белагропромбанк» и телефоны, по которым можно получить справку о продаже облигаций:
г. Брест, ул. Воровского, 11, тел. (8-0162) 27-06-61, 27-06-01,
г. Витебск, ул. Димитрова, 31, тел. (8-0212) 35-00-21, 37-23-14,
г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, тел.(8-0232) 79-26-89, 79-26-33,
г. Гродно, ул. Советских Пограничников, 110, тел. (8-0152) 52-25-87,
г. Могилев, пр-т Мира, 55, тел. (8-0222) 29-37-50,
г. Минск, пр-т Победителей, 91, тел. (8-017) 209-77-91, 209-77-73,
г. Минск, ул. Ольшевского, 24, тел. (8-017) 228-59-02, 228-65-35,
г. Минск, пр-т Жукова, 3, тел. (8-017) 218-57-11.

**Заместитель Председателя Правления ОАО «Белагропромбанк»** **С.П. Чугай**

**Главный бухгалтер ОАО «Белагропромбанк»** **М.А. Шаповалова**

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
время работы Контакт-Центра Банка
8.00–20.00 – рабочие дни
8.00–18.00 – выходные и праздничные дни
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), Velcom, МТС) – по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

*Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь.* УНП 100693551.

# ЗА ВАГОЙ ЗАПЛЕЧНІКАЎ ШКОЛЬНІКАЎ БУДУЦЬ САЧЫЦЬ ПЕДАГОГІ?

**У новым навучальным годзе ў школьных педагогаў можа з'явіцца яшчэ адзін дадатковы абавязак — сачыць за вагой партфеляў, ранцаў і заплечнікаў сваіх вучняў. З 1 верасня ў краіне ўводзяцца новыя Гігіенічныя патрабаванні да ўладкавання, утрымання і арганізацыі адукацыйнага працэсу ў агульнаадукацыйных установах.**

— У новых гігіенічных патрабаваннях, у прыватнасці, занатаваная вага штодзённага камплекту падручнікаў для навучэнцаў, — патлумачыла журналісту «Звязды» **загадчыца аддзялення гігіены дзяцей і падлеткаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ала МАЛАХАВА**. — Разам з пісьмовымі прыладамі вага штодзённага камплекта падручнікаў для вучняў 1-га і 2-га класаў школ не павінна перавышаць 1,5 кілаграма. Для вучняў 3-4 класаў — 2,5 кілаграма, 5-х і 6-х — 3 кілаграмы, 7-х і 8 —х — 3,5 кілаграма і 9-11-х класаў — 4 кілаграмы. Яшчэ раней у новых гігіенічных патрабаваннях да вучнёўскіх ранцаў, заплечнікаў і партфеляў, якія ўступілі ў дзеянне з 1 чэрвеня гэтага года, мы ўстанавілі наступнае абмежаванне: вага скургалантарэйных вырабаў, разлічаных на вучняў пачатковых класаў, павінна быць не большая за 600-700 грамаў. А заплечнік ці партфель, разлічаны на навучэнцаў сярэдніх і старэйшых класаў, павінен важыць не больш за кілаграм. Значыць, агульная вага заплечніка старшакласніка павінна быць у межах 5 кілаграмаў. Акрамя вагі, мы абмежавалі таксама шырыню партфеля, яго вышыню і нават колькасць накладных кішэняў, бо чым больш будзе кішэняў, тым большай будзе ў падлетка спакуса пакласці туды нешта лішняе. Мы ўпэўненыя, што насіць поўны камплект падручнікаў з 5-6 кніг старшакласнікам няма ніякага сэнсу — дастаткова і аднаго падручніка на парту. У пачатковай школе ўвогуле павінны быць прадугледжаныя індывідуальныя шафы-ячэйкі або ўбудаваныя шафы для захоўвання прыладаў для ўрокаў працоўнага навучання, кніг для дадатковага чытання ў класе, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў. Пры праектаванні, будаўніцтве і рэканструкцыі будынкаў агульнаадукацыйных устаноў індывідуальныя шафы павінны быць прадугледжаны таксама і для вучняў старэйшых класаў. А пакуль што мы проста вымушаны змагацца з тым цяжарам, які нашы дзеці носяць за сваімі плячыма штодня. І мы збіраемся знайсці падтрымку і разуменне гэтага пытання ў педагогаў. Няхай кіраўніцтва школ вырашае, хто будзе сачыць за вагой школьных сумак і заплечнікаў: класныя кіраўнікі, завучы ці нехта іншы. А з вучнямі і іх бацькамі абавязкова трэба весці тлумачальную работу.

> **Рамонтам мэблі, спартыўнага і гульнявога рыштунку дазваляецца займацца толькі вучням з 8-га па 11-ты класы, а да мыцця падлогі дазваляецца прыцягваць толькі падлеткаў з 14 гадоў.**

Быў занатаваны ў новым дакуменце і яшчэ адзін прынцыповы момант — патрабаванні, якія тычацца арганізацыі грамадска-карыснай працы навучэнцаў. Можна не сумнявацца, што многіх бацькоў цікавіла пытанне, чаму іх дзеці, скажам, мыюць падлогу ці вокны ў класе. Як вынікае з дакумента Міністэрства аховы здароўя, вучні першых і другіх класаў могуць прыцягвацца да грамадска-карыснай працы 25 хвілін у тыдзень, у трэціх і чацвёртых класах — 45 хвілін у тыдзень, у 5-8-х класах — у межах адной гадзіны і ў 9-11-х — 1,5 гадзіны ў тыдзень. У рамках грамадска-карыснай працы вучні 1-2 класаў могуць выконваць работы па самаабслугоўванні, напрыклад, праводзіць уборку свайго працоўнага месца, прыбіраць посуд са сталоў. З 3-га класа школьнікам дазваляецца даглядаць пакаёвыя расліны, праводзіць вільготную прыборку пылу ў вучэбных памяшканнях. З 5-га класа дзяцей могуць прыцягваць да прыборкі тэрыторыі. З 7-га класа — да дзяжурстваў у сталовай. Рабіць вільготную прыборку ў памяшканні могуць толькі вучні 8-11 класаў, а да мыцця падлогі дазваляецца прыцягваць толькі падлеткаў з 14 гадоў. Збіраць гербарыі, рамантаваць наглядныя і вучэбныя дапаможнікі ці кнігі ў бібліятэцы можна як старшакласнікам, так і малодшым школьнікам, пачынаючы з 3-га класа. Азеляненнем і доглядам кветнікаў і газонаў можна займацца з пятага класа, а рамонтам мэблі, спартыўнага і гульнявога рыштунку дазваляецца займацца толькі вучням з 8-га па 11-ты класы. **Катэгарычна забараняецца прыцягваць школьнікаў да работ, небяспечных як у эпідэмічным плане (такіх як прыборка санвузлоў, умывальных пакояў, вываз нечыстот), так і небяспечных для жыцця, напрыклад, да апрацоўкі чашы плавальнага басейна, мыцця вокнаў і іншых вырабаў са шкла, а таксама электрасвяцільняў.**

У гутарцы з журналістам «Звязды» Ала Малахава паведаміла, што быў перагледжаны і пералік прадукцыі, дазволенай у харчаванні школьнікаў.

— Мы выключылі з яго закусачныя кансервы з гародніны (салянкі, рагу), пры прыгатаванні якіх выкарыстоўваецца воцат, і закусачныя рыбныя кансервы, — патлумачыла загадчыца аддзялення гігіены дзяцей і падлеткаў, — калі пры іх прыгатаванні выкарыстоўвалася вэнджаная ці смажаная рыба (рыбныя кансервы ў таматным соусе, у марынадзе, у жэле, кансервы-паштэты, шпроты і г. д.). Прыкладны пералік асартыментнай прадукцыі, дазволенай да рэалізацыі ў школьных буфетах, уключае свежую садавіну і гародніну, салаты са свежай гародніны са свежай зелянінай, салаты з морапрадуктаў, тварожныя вырабы (сыркі, пудынгі) у прамысловай парцыённай упакоўцы, сыры, сухія сняданкі тыпу мюсляў у выглядзе батончыкаў. З кандытарскіх вырабаў да продажу дапускаюцца мармелад, зефір, шакалад, вафлі, з ласункаў — жэле, арэхі, сухафрукты, казінакі, з напіткаў — малако, кісламалочныя напіткі, сокі і нектары, напіткі з журавін, шыпшыны і іншыя карысныя вітамінізаваныя напіткі. Зразумела, што ні газіроўкі, ні чыпсаў у школьных буфетах быць не павінна.

Спынілася Ала Малахава і на яшчэ адным істотным дапаўненні. Усе, напэўна, памятаюць апошнюю марозную зіму. У рэгіёнах у кіраўнікоў сістэмы адукацыі нярэдка ўзнікалі пытанні, а што рабіць з малодшымі школьнікамі, калі на двары трашчыць мароз, асабліва, калі размова ішла пра вучняў сельскіх школ. Як правіла, кіраўнікам органаў улады накіроўваліся рэкамендацыі спыняць пры моцных маразах вучэбны працэс у школах, ва ўсялякім выпадку ў пачатковых класах. Цяпер гэты важны момант знайшоў адлюстраванне ў Гігіенічных нарматывах. Пры неспрыяльных умовах надвор'я (ураган, тэмпература паветра мінус 25 градусаў па Цэльсію) мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі можа прымацца рашэнне аб часовым спыненні адукацыйнага працэсу ў 1-4-х, а таксама і ў іншых класах. Гэта значыць, што цяпер не трэба чакаць ніякіх рэкамендацый з боку Міністэрства аховы здароўя, тым больш што ў галоўным медыцынскім ведамстве не могуць ведаць, дзе і якія складваюцца ўмовы надвор'я. Такія пытанні павінны вырашацца аператыўна на месцы.

Як вядома, у сельскіх рэгіёнах кожны год павялічваецца колькасць зачыненых школ і арганізуецца падвоз школьнікаў у іншыя ўстановы адукацыі. Аказваецца, існуе і спецыяльны нарматыў, хто з дзяцей можа разлічваць на падвоз да суседняй школы. Транспартнаму абслугоўванню падлягаюць вучні 1-4-х класаў, якія пражываюць на адлегласці больш як 2 кіламетры ад агульнаадукацыйных устаноў, і вучні 5—11-х класаў, якія пражываюць на адлегласці больш як 3 кіламетры ад агульнаадукацыйных устаноў. Для транспартнага абслугоўвання школьнікаў вызначаны гранічны радыус, які не можа перавышаць 15 кіламетраў. А пры перавышэнні радыуса транспартнага абслугоўвання пры агульнаадукацыйнай установе павінен быць прадугледжаны інтэрнат. Падвоз навучэнцаў можа ажыццяўляцца грамадскім або спецыяльна выдзеленым для гэтых мэтаў транспартам.

**Даведка «Звязды»:**

**Новыя гігіенічныя патрабаванні да вучнёўскіх ранцаў, заплечнікаў і партфеляў (дзейнічаюць з 1 чэрвеня гэтага года):**

**На сумках і заплечніках абавязкова павінны прысутнічаць святлоадбівальныя элементы (тасьма, стужка, накладкі ці ўстаўкі) — на пярэдніх, бакавых паверхнях і верхнім клапане. Плечавыя рамяні павінны рэгулявацца ў адпаведнасці з ростам навучэнца, мець раз'ём, які аблягчае надзяванне і зніманне ранца ці заплечніка, вырабляцца шырынёй не менш як 30 мм з ахоўнай плечавой накладкай. Усе спражкі і іншыя прыстасаванні для змянення даўжыні рамянёў павінны мацавацца на донцы ранца ці заплечніка. Вырабы павінны добра трымаць форму: для гэтага ў ранца для малодшых школьнікаў прадугледжваецца спецыяльная формаўстойлівая спінка.**

**Усе вырабы павінны суправаджацца маркіроўкай з інфармацый пра іх адпаведнасць узросту школьніка: «Для навучэнцаў пачатковых класаў» ці «Для навучэнцаў сярэдніх і старэйшых класаў».**

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# «Міс Максім» я стала пасля ўдзелу ў конкурсе «Міс Беларусь»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

— Афіцыйны адказ гучаў так: татуіроўка. Хоць яна вельмі маленькая і практычна нябачная, усё адно ў фінал «Міс Беларусь-2008» я не прайшла. Было вельмі крыўдна, бо да гэтага конкурсу я рыхтавалася вельмі сур'ёзна... Але прыкладна ў той жа час прачытала пра конкурс «Міс Максім» — і вырашыла паспрабаваць свае сілы там. Нездарма ж кажуць, што апетыт прыходзіць падчас яды! У выніку я нейкім цудам перамагла!

***— Фотасесія для «Максім» патрабуе пэўнага агалення. Не кожная дзяўчына на гэта пагодзіцца. Як адважылася ты?***

— Калі я толькі пачынала працаваць мадэллю, то гэтую школу, калі ўсяго саромеешся, я прайшла. Напрыклад, калі паказ бялізны — і табе трэба хутка-хутка яе мяняць. Спачатку ніякавата, але пасля прывыкаеш: з табой працуюць прафесіяналы, яны цябе ўспрымаюць не як жанчыну, а як аб'ект для дэманстрацыі адзення. І з фотасесіяй для «Максім» — тое самае. Не было такога: «вой, а павярніся так; вой, а што ў цябе там.» Усё роўна цябе ў штосьці адзяваюць, чымсьці прыкрываюць — поўнага агалення няма. Табе дазваляюць прыкрывацца рукамі, даюць якія-сьці ўпрыгажэнні, якія ўсё хаваюць. Здымкі праходзяць прыгожа і прыстойна — і вынік радуе.

***— Як адрэагавалі на гэтыя здымкі твае сваякі?***

— Па-рознаму. Хтосьці — з асцярогай, хтосьці — і добра. Людзі старэйшага пакалення, у тым ліку мая мама, даволі кансерватыўныя. Я прыклала шмат намаганняў, каб мама стала больш спакойна ставіцца да маіх здымак і радавацца таму, што яе дачку друкуюць на старонках аднаго з самых папулярных выданняў свету.

> **ТОП-5 для Яўгеніі Няронскай:**
>
> ***1. Ці лічыш конкурсы прыгажосці суб'ектыўнымі?***
>
> — Так, вядома. Заўжды выбіраюць людзі, а яны кіруюцца ўласнай думкай.
>
> ***2. Ці плануеш прыняць удзел у Міс Беларусь-2012?***
>
> — Не (*смяецца*).
>
> ***3. Ці хацела б зняцца для «Плэйбоя»?***
>
> — Так. Я ўжо здымалася — у купальніку рэкламавала «Мазду».
>
> ***4. Ці хацела б, каб твае дзеці пайшлі па тваёй дарозе?***
>
> — Я хачу, каб мае дзеці займаліся тым, што ім будзе цікава. Хачу, каб яны вучыліся ў нас яркаму жыццю, ды і самі былі яркімі асобамі.
>
> ***5. Без якога аксесуара туалета ты ніколі б не выйшла на публіку?***
>
> — Я магу выйсці на публіку ў любым выглядзе, незалежна ад таго, нафарбаваная я ці не, на абцасах ці без іх. Галоўнае, каб я адчувала сябе камфортна.

***— А як рэагавалі выкладчыкі ўніверсітэта?***

— У прынцыпе асаблівай рэакцыі я не заўважыла. Яны далі мне зразумець, што ведаюць пра мае здымкі ў «Максім», але на абмеркаванне пры ўсёй групе гэтую тэму не выносілі. А так — асабіста ў кабінет, каб адчытаць, мяне ніхто не выклікаў *(усміхаецца)*.

***— А малады чалавек?***

— Пра свой удзел я яму расказала, калі ўжо прайшла ў фінал. Але ён мяне падтрымаў. На фінал у Маскву ён паехаў ужо разам са мною: паўсюль хадзіў побач, ахоўваў.

## ЯК ЖЭНЯ ПАКАРЫЛА МАЛАЙЗІЮ...

***— У маі ты ўвайшла ў пяцёрку самых прыгожых дзяўчат на конкурсе «Міс Турызм Інтэркантыненталь-2010», стаўшы трэцяй віцэ-міс (гл. «Звязду» ад 22 мая). Раскажы пра сам конкурс.***

— Конкурс быў проста шыкоўны. Ён праходзіў з вялікім размахам па ўсёй краіне. Кожныя тры дні мы прыязджалі ў новы горад Малайзіі, дзе арганізоўвалася папярэдняе шоу, дзе выбіралі самую артыстычную, самую спартыўную і г. д. Пасля мы прыехалі на востраў Барнэа, дзе і рыхтаваліся да фіналу. Увогуле, мы аб'ехалі ўсю Малайзію — хадзілі па джунглях, лазілі па пячорах...

***— Але перамагла на конкурсе зноў прадстаўніца Венесуэлы. Як лічыш, венесуэлкі сапраўды самыя прыгожыя ці ім сёлета проста шанцуе?***

— У мяне склалася ўражанне, што венесуэлкі больш прафесійна трымаюць сябе на сцэне. Калі дзяўчына выходзіла на сцэну, было адчуванне, што яна адна кантралюе ўвесь (!) стадыён. Сваёй энергетыкай яна трымала масы. Мне здаецца, венесуэлак з дзяцінства проста рыхтуюць, вучаць танцам, вакалу і ўменню паказаць сябе. Калі гаварылі дзяўчаты з Амерыкі і Венесуэлы — усе былі ў захапленні, мы проста не маглі іх пераўзысці. Гэтым уменнем яны і бяруць. Аднойчы падчас прэс-канферэнцыі, на якую запрасілі ўсіх дзяўчат, я знарок паставіла відэакамеру, каб пагледзець, як мы ўсе разам глядзімся — такі адмысловы погляд збоку. І што вы думаеце — праз гадзіну ўсе дзяўчаты з нагі на нагу перамінаюцца, вочы ад гарачыні закатваюць. І толькі венесуэлка і амерыканка стаяць з галівудскай усмешкай, у адной і той жа позе, уважліва сочачы за тымі, хто гаворыць...

***— Але табе пашанцавала. Ты адна з нямногіх еўрапеек, хто трапіў у фінал...***

— У фінал прайшлі Малайзія, Венесуэла, ЗША, Латвія, Беларусь, Філіпіны, Аўстралія, Туніс, Бразілія і Тайланд. На конкурсе ў мяне было такое правіла: нават калі ў цябе дрэнны настрой ці баліць галава — усё роўна ты павінна ўсім усміхацца, быць прыветлівай — з усімі павітацца, што-небудзь сказаць на іх мове... І ніяк не паказваць, што ты стамілася і хочаш дадому. Павінна быць вытрымка. Напрыклад, у прадстаўніцы Украіны літаральна праз тыдзень конкурсу гэтай вытрымкі ўжо не было: пачыналася істэрыка — я не хачу, мне надакучыла. І хоць яна вельмі прыгожая дзяўчына, публіка адчула яе стомленасць — у фінал украінка не патрапіла. Стратэгія ў такіх рэчах таксама важная.

## «У ЖУРНАЛІСТЫКУ Я ХУТКА ВЯРНУСЯ...»

***— Літаральна нядаўна ты скончыла ўніверсітэт з дыпломам журналіста. Калі б павярнуць час назад, ці выбрала б іншую прафесію?***

— Не, іншую не выбрала б. Мне вельмі падабаецца журналістыка. Першыя тры курсы ўніверсітэта ў мяне было моцнае імкненне працаваць. Пастажыраваўшыся ў некалькіх тэлевізійных рэдакцыях Мінска, я была проста ў захапленні. Але пасля з'явіліся іншыя інтарэсы, ад журналістыкі паступова адышла. Але каб справу рабіць прафесійна — ёй трэба займацца пастаянна. Думаю, як скончу з мадэльным бізнэсам — у журналістыку я вярнуся. Паглыблюся ў ёй і пастараюся стаць сапраўдным прафесіяналам. Ужо зараз мне не хапае пастаянных здымак — хочацца працаваць у эфіры.

**Гутарыў Ілья ЛАПАТО.**

**Ведай нашых!**

# ТРЫУМФ ЮНАГА БЕЛАРУСА. ДУБЛЬ ДВА!

Быць першым сярод лепшых гомельскі школьнік Генадзь Караткевіч даўно прызвычаіўся. Прызёрам рэспубліканскай школьнай алімпіяды па інфарматыцы хлопчык стаў яшчэ ў пачатковай школе. А ва ўзросце 11 гадоў Гена стаў самым юным удзельнікам міжнароднай школьнай алімпіяды па інфарматыцы і самым юным пераможцам гэтых інтэлектуальных спаборніцтваў: з першай жа спробы ён здолеў заваяваць сярэбраную ўзнагароду. Трэба патлумачыць, што ўзроставы цэнз для ўдзельнікаў алімпіяды складае 20 гадоў і на алімпіяду прыязджаюць, як правіла, выключна старшакласнікі. Затым два гады запар хлопчык заваёўваў на міжнародных алімпіядах залатыя ўзнагароды, прычым летась у Балгарыі ён стаў абсалютным пераможцам свету, набраўшы максімальную колькасць балаў.

Апошняя 22-я міжнародная алімпіяда па інфарматыцы, якая праходзіла ў Канадзе і сабрала тры сотні школьнікаў з 83 краін, зноў завяршылася абсалютнай перамогай беларускага школьніка. Дзевяцікласнік гомельскай гімназіі № 56 упершыню ў гісторыі інтэлектуальных спаборніцтваў стаў абсалютным іх пераможцам другі год запар, набраўшы 778 з 800 магчымых балаў. Юнак з Балгарыі, які заняў у асабістым рэйтынгу другое месца, набраў толькі 749 балаў, сур'ёзна адстаўшы ад беларуса.

Акрамя абсалютнай перамогі беларускія школьнікі прывезлі з міжнароднай алімпіяды па інфарматыцы таксама яшчэ і тры бронзавыя ўзнагароды: іх уладальнікі Алексей Колесаў, Яўген Грыцкевіч і Павел Калліннікаў ужо сталі студэнтамі Белдзяржуніверсітэта.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# «Саміт» сувораўцаў Беларусі і Расіі

**Гэтымі днямі ў Крыме, у Анапе, праходзіць ваенна-патрыятычная змена для навучэнцаў суворўскіх вучылішчаў Беларусі і Расіі.**

Ваенна-патрыятычная змена праходзіць ужо чацвёрты год запар пад эгідай Саюзнай дзяржавы на курортах Чарнаморскага ўзбярэжжа Расійскай Федэрацыі. Дэвіз сустрэч юных вайскоўцаў — «Маладая змена абаронцаў Айчыны».

Што даюць яны хлопцам абедзвюх краін? У першую чаргу, круглыя сіроты, якіх нямала сярод суворўцаў, паўнавартасна адпачнуць на беразе мора. Для гэтага ў санаторыі «Віта» створаны ўсе ўмовы. Сёлета ў праграме змены таксама запланавана правядзенне конкурсаў патрыятычнай і страявой песні, афіцэрскага балю, ваенна-спартыўных гульняў, турыстычных паходаў па месцах баявой славы, а таксама шэраг урачыстых мерапрыемстваў.

Мерапрыемства фінансуецца з бюджэту Саюзнай дзяржавы і праводзіцца па ініцыятыве камісіі Парламенцкага Сходу па бяспецы, абароне і барацьбе са злачыннасцю сумесна з Камісіяй Парламенцкага Сходу па сацыяльнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях. Арганізатарамі змены сталі міністэрствы абароны Беларусі і Расійскай Федэрацыі.

Мяркуецца, што дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Яўген Казімірчык і Сяргей Крыжэвіч прымуць удзел ва ўрачыстым закрыцці ваенна-патрыятычнай змены. Разам з расійскімі парламентарыямі яны ўручаць памятныя прызы і падарункі суворўцам Беларусі і Расіі.

**Леанід ТУГАРЫН.**

# «ХЛОПЦЫ НЕ ПЛАЧУЦЬ»

## ці Як перажыць разрыў



**«Хлопцы не плачуць», — абвяшчае вядомы выраз. Сапраўды, складана ўявіць, што мужчына, расстаўшыся са сваёй пасіяй, будзе ліць слёзы, насіць жалобу і адольваць сяброў сваімі скаргамі. Тым часам, лічаць спецыялісты-псіхолагі, хлопцы значна больш адчувальныя, чым лічым мы, жанчыны, і не так проста перажываюць, калі іх пакідае дама сэрца. Мужчынскія часопісы часта абыходзяць гэтую тэму сваёй увагай, і толькі нямногія з іх не баяцца паказаць «слабасць» і параіць, што рабіць таму, хто застаўся адзін.**

Гэтымі рэкамендацыямі псіхолага Ганны Селіванавай ты можаш скарыстацца як для дапамогі свайму сябру, які расстаўся з дзяўчынай, так і скарыстаць іх для сябе, каб навучыцца лепш разбірацца ў сваёй мужчынскай жа псіхалогіі.

Такім чынам, пасля таго, як дзяўчына сказала свайму кавалеру, што ім трэба расстацца, першы парыў мужчыны — кінуцца на калені і маліць яе не рабіць гэтага. На жаль, вярнуць шчаслівыя дзянькі ўжо не атрымаецца, таму адзінае, што застаецца, — гэта паспрабаваць як мага хутчэй забыць сваю «крыўдзіцельніцу».

Першае, што раяць псіхолагі — скінуць яе з пастамента. Перастаць абагаўляць, гадзінамі з уздыхамі глядзець на яе фотаздымкі, імгненна адказваць на любы званок ці электронны ліст і ў любое надвор'е імчацца выконваць яе даручэнні.

«Супакойся, дружа, — зараз у цябе іншыя прыярытэты. Яна сама адмовілася ад цябе, таму не дазваляй ёй маячыць на тваім жыццёвым шляху», — раяць амерыканскія псіхатэрапеўты. Наступны крок — расставіць усе кропкі над «і», прычым зрабіць гэта павінна дзяўчына. Гэта значыць, сказаць, што яны ніколі не будуць разам, іх агульным дзецям (калі яны планаваліся) не наканавана з'явіцца на свет і ўсё ў такім духу. Тэрапеўты завуць гэта «закрыццём»: толькі пасля таго, як зачыніце гэтыя дзверы, можна адчыняць іншыя.

Адна з самых распаўсюджаных памылак, якія робяць пакінутыя мужчыны, — гэта псіхалагічныя атакі на былую ўжо сяброўку: званкі, SMS-кі, лісты і іншыя спосабы нагадаць пра сябе. Тут няшчаснаму Рамэо варта зразумець толькі адно: дзяўчыне ўжо напляваць на яго пакуты, і кропка. Дык ці варта марнаваць свой час на пошукі зносінаў з ёй?

Карысна выказаць свае пачуцці на паперы — урэшце, яна ўсё стрывае. «Тут галоўнае не баяцца здацца самому сабе сентыментальным, а то некаторыя нават сам-насам з сабой увесь час спрабуюць выглядаць гэткімі мужнымі мáча, у якіх у прынцыпе не бывае праблем. Аднак свае споведзі ні ў якім выпадку не трэба адпраўляць дзяўчыне — хутчэй за ўсё, яна толькі пасмяецца над гэтай слабасцю, а то і пакажа гэты ліст свайму новаму кавалеру і сяброўкам», — кажа спецыяліст.

Вось яшчэ некалькі парадаў псіхолагаў: «Свае звычкі на час трэба памяняць, асабліва што датычыць забаў — лепш не хадзіць па тых жа кавярнях і клубах, дзе некаторы час назад вы дэманстравалі акружаючым шчырасць сваіх пачуццяў. Ад зносінаў з яе сябрамі таксама варта адмовіцца — гэта яе тэрыторыя. Пакуль ты яшчэ не астыў, забудзься пра гэтых людзей. Выкінь усё, што нагадвае табе пра яе — кнігі, дыскі, фота, яе рэчы, падарункі і гэтак далей, нават калі табе прыйдзецца выкінуць палову свайго гардэроба, каб пазбавіцца ад цяжкіх успамінаў, — зрабі гэта. Тут правіла адно: калі штосьці абуджае ў цябе ўспаміны пра тваю былую каханую, гэта падлягае знішчэнню».

Калі ўжо што і ўспамінаць — дык гэта самыя непрыемныя моманты. Напрыклад, як яна гадзінамі збіралася, пакуль ты цярпліва чакаў яе, ці як яна ўвесь час капала на мазгі, ці як яна на кожнае 23 лютага дарыла адно і тое ж — гель для галення.

А вось што мужчыну рабіць нявapта — дык гэта патрабаваць вярнуць свае рэчы. Плэер, шкарпэткі, зубная шчотка — усё гэта не варта таго, каб трываць боль пры сустрэчы з жорсткай дамай. «Не мяняй сваю годнасць на нейкія там трусы», — вельмі разумная рэкамендацыя.

Як бы балюча не было, цяпер зноў трэба цешыцца жыццём і здабытымі магчымасцямі. «Зараз ты можаш падміргваць любой красуні, і ніхто не будзе піхаць цябе локцем у бок, ты зможаш, нарэшце, сабраць мадэль карабля, якая вось ужо два гады пылілася на антрэсолях, заняцца спортам, папіць піва з сябрамі і не начаваць дома. Ты вольны, дружа!..

**Наталля СІНІЦА.**

# Міжнародная кінашкола краін СНД аб'явіла новы набор слухачоў

**У трэці раз яна збярэ маладых кінематаграфістаў краін Садружнасці, а таксама Грузіі, Латвіі, Літвы і Эстоніі ў Падмаскоўі ў комплексе Дзяржфільмафонда з 24 кастрычніка па 2 лістапада, паведаміў БЕЛТА прэс-сакратар Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД Аляксандр КАЛУГІН.**

Сёлета да ўдзелу ў кінашколе запрошаныя пачаткоўцы трох кінапрафесій: рэжысёраў гульнявога і дакументальнага кіно, драматургаў і крытыкаў. Прэтэндаваць на вучобу ў кінашколе могуць навучэнцы апошніх курсаў і выпускнікі аддзяленняў кінарэжысуры і кінадраматургіі кінаВНУ і кінааддзяленняў творчых ВНУ.

Адбор слухачоў ажыццяўляецца па выніках прагляду іх творчых работ. Заяўкі на ўдзел у кінашколе прымаюцца да 3 верасня.

Праект рэалізуецца Канфедэрацыяй саюзаў кінематаграфістаў і Дзяржфільмафондам Расіі пры падтрымцы Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД. Кіруе ім вядомы расійскі рэжысёр Рустам Ібрагімбекаў. У 2009 годзе ў працы II Міжнароднай кінашколы ўзялі ўдзел больш за 40 слухачоў з 13 краін.

# УЛАДАЛЬНІЦАЙ ТЫТУЛА «МІС СУСВЕТ» СТАЛА МЕКСІКАНКА




Чарговы конкурс на самую прыгожую дзяўчыну планеты завяршыўся некалькі гадзін таму ў Лас-Вегасе. Уладальніцай тытула «Міс Сусвет» стала 22-гадовая мексіканка Хімена Наварэтэ, паведамляюць інфармагенцтвы.

Чароўная мексіканка абышла канкурсантак з 82 краін. Яна больш удала, чым астатнія, выступіла ў заключных турах — дэфіле ў купальных касцюмах, вячэрніх сукенках і адказах на пытанні журы.

«Міс Сусвет» атрымлівае брыльянтавую карону з наборам ювелірных упрыгажэнняў ад кампаніі «Дайманд нексус лэбс» і зарплату, памер якой аргкамітэт не ўдакладняе. Акрамя таго, пераможца зможа бясплатна вучыцца на працягу года ў кінаакадэміі Нью-Ёрка, а таксама атрымае ў поўнае карыстанне раскошныя апартаменты. У прызавы пакет уладальніцы тытула таксама ўваходзяць калекцыйны абутак, купальнікі, наборы па доглядзе скуры, валасоў, паслугі вядучых цырульнікаў, стылістаў, дэрматолагаў, спортінструктараў і многае іншае. Другое і трэцяе месцы занялі Ендзі Філіпс з Ямайкі і Джэсінта Кэмпбэл з Аўстраліі. Асобныя прызы сімпатый і тытул «Міс фотагенічнасць» дасталіся аўстралійцы Кэмпбэл і Фанціп Ватчаратракул з Тайланда. Яна зачаравала журы і публіку шыкоўным нацыянальным касцюмам.

# ГРОШЫ... ХУТКА І БЕЗ ПРАБЛЕМ?

**Бываюць у жыцці такія крызісныя сітуацыі, калі воляй-няволяй задумваешся над пытаннем, дзе хутка і бестурботна ўзяць грошы. Пагадзіцеся, што кожнаму з нас даводзілася хоць раз вырашаць матэрыяльную праблему. Нехта робіць пазыку ў сяброў, родных, знаёмых... Карацей кажучы, у таго, хто згодны пазычыць пэўную суму на пэўны тэрмін. Нехта шукае дапамогі па банках. Камусьці прасцей уладкавацца на дадатковую працу і зарабіць энную суму за кошт свайго вольнага часу і здароўя. Але ёсць асобны разрад насельніцтва, прычым не толькі ў нашай краіне, які вырашае сваю матэрыяльную праблему прасцей — ідзе ў ламбард. Такія ўстановы — гэта самы хуткі і просты спосаб атрымання грошай. А часам і ці не адзіная альтэрнатыва крэдытам, якія банкі не заўсёды згодныя выдаць. У нашай краіне асноўнымі наведвальнікамі ламбардаў з'яўляюцца пенсіянеры, студэнты, а часам і бізнэсмены. У Расіі дык наогул апомніліся падчас фінансава-эканамічнага крызісу і пачалі пакідаць ва ўстановах такога кшталту «Бентлі», «Майбахі», «Паршэ», гадзіннікі вядомых марак, элітныя футры, дызайнерскія мабільныя тэлефоны і гэтак далей.**

## Трохі гісторыі...

**Ламбард можна назваць адной з самых старажытных эканамічных устаноў, створаных чалавекам. Пачатак у стварэнні арганізацый, якія займаюцца выдачай грошай пад заклад той або іншай маёмасці, пакладзены Кітаем. Калі давяраць пісьмовым крыніцам, то там ламбарды з'явіліся больш за тры тысячагоддзі таму.**

Звыклы ж для нас выгляд гэтыя ўстановы прынялі ў Сярэднявечнай Еўропе, дзе яны былі наноў вынайдзены гандлярамі з Ламбардыі. Адсюль і назва гэтай дзейнасці. Сярод кліентаў такіх устаноў былі нават асобы каралеўскай крыві. Напрыклад, Эдуард III англійскі. А ў XV стагоддзі для пакрыцця выдаткаў на арганізацыю падарожжа Хрыстафора Калумба каралева Ізабела іспанская ўзяла вялікую пазыку, забеспячэннем якой выступіла брыльянтавая карона. У хуткім часе ламбарды распаўсюдзіліся па ўсёй Еўропе. У Нюрнбергу ў XVI стагоддзі быў адчынены першы муніцыпальны ламбард. Установы такога кшталту ў далейшым мелі за мэту падтрымку збяднелых пластоў насельніцтва шляхам выдачы ім невялікіх грашовых выплат. Такая дзейнасць ламбардаў спыняла выпадкі крадзяжоў.

Шырока вядомыя таксама «**абутковыя ламбарды**», якія атрымалі сваё распаўсюджанне ў XIX стагоддзі. Яны прымалі святочны абутак ад працоўнага насельніцтва (з панядзелка да пятніцы ён усё роўна не патрэбны). У канцы тыдня, пасля атрымання заробку, працоўныя або служачыя маглі выкупіць свой абутак і апрануць яго для ўдзелу ў суботніх і нядзельных мерапрыемствах.

У XX стагоддзі колькасць ламбардаў павялічылася, з'явілася спецыялізацыя: па каштоўнасцях, антыкварыят, бытавая і іншая тэхніка, аўталамбард і аўтакрэдыт.

## На дзень сённяшні...

У наш час ламбарды існуюць па ўсім свеце. Зараз гэта камерцыйная арганізацыя, якая спецыялізуецца на выдачы фізічным асобам кароткачасовых пазык пад заклад каштоўных прадметаў. Напрыклад, ювелірных вырабаў, твораў мастацтва, аўтамабіляў, разнастайнай тэхнікі і гэтак далей. У ламбардзе адбываецца ацэнка закладу і заключаецца дагавор захоўвання. Кліент атрымлівае закладны квіток і законную суму грошай.

Асабліва распаўсюджаная такая форма фінансавай дзейнасці ў краінах, дзе назіраецца стабільнае развіццё эканомікі, і ўзровень жыцця насельніцтва даволі высокі. Напрыклад, у ЗША, дзе цяпер функцыянуе больш за шаснаццаць тысяч ламбардаў.

На сёння сур'ёзны ламбард — гэта фінансавая арганізацыя, абсталяваная самай новай тэхнікай. Іх гаспадары імкнуцца да таго, каб узровень абслугоўвання кліентаў у такой установе не быў горшым за ўзровень абслугоўвання ў вядучым банку краіны.

## Як паказвае практыка...

**По назіраннях спецыялістаў, ажыятажу сёння вакол такой з'явы, як ламбард не назіраецца. Частка пастаянных кліентаў ад агульнага ліку тых, хто сюды звярнуўся па дапамогу, складае 30 %.** І не трэба думаць, што ва ўстановы падобнага кшталту звяртаюцца альбо зусім збяднелыя людзі, альбо тыя, каму надта патрэбныя грошы. Не, гэта зусім не так. Здараюцца розныя праблемныя сітуацыі. А ламбард — гэта цывілізаваны спосаб іх вырашыць.

Нясуць у асноўным ювелірныя вырабы або тэхніку. Але прымаюць далёка не ўсё. Напрыклад, відэамагнітафон, які раней каштаваў вой як дорага, сёння ніякай каштоўнасці не мае.

Аб спецыфіцы працы такіх устаноў, як ламбарды я даведвалася на асабістым вопыце. Зразумела, золата пакідаць там я не збіралася. Але старэнькі мабільны тэлефон, які ляжыць у мяне без справы ўжо больш за паўгода, мне было не шкада. Тым больш, што не проста так, а за грошы. Няхай і невялікія. Галоўным для мяне была не цана, а інфармацыя, якую я атрымала такім чынам.

Па Мінску ламбардаў хапае і нават з гакам. Амаль што на кожнай вуліцы яны ёсць: і на Сурганава, і на Якуба Коласа, і на Багдана Хмяльніцкага, і на Максіма Багдановіча... Трэба толькі ўважліва паглядзець, каб заўважыць аб'яву з адпаведным надпісам і паказальнікам, куды трэба прайсці. Часцей уваход у ламбард размяшчаецца дзесьці ў двары.

Сваю рэч можна пакінуць у ламбардзе як на час, так і назаўсёды. У першым выпадку, пры жаданні забраць назад сваю маёмасць, трэба будзе аплаціць працэнты, якія набягалі за той час, што вы карысталіся грашыма. Амаль што як у банку, толькі працэнтная стаўка нашмат ніжэйшая. У выніку атрымліваюцца капейкі. А вось пакідаючы рэч назаўсёды, трэба заплаціць падатак, які складае ад 10 да 13 працэнтаў ад агульнай сумы. Затое афармленне ўсіх неабходных дакументаў займае хвілін 20. Гэта калі пашанцуе з супрацоўнікам, а дакладней кажучы з прыёмшчыкам. Мне пашанцавала не вельмі. Жанчына з надта невясёлым выразам твару паглядзела на мяне так, як быццам я прынесла скрадзенае. І спяшацца з афармленнем дакументацыі яна не збіралася. Ды яшчэ і асаблівай ветлівасцю не вызначылася. На ўсе мае пытанні, а іх у мяне было шмат, яна адназначна адказвала кіўком галавы або ў адзін бок, што азначала «**так**», або ў другі, што значыла «**не**», або наогул словамі «**усё вывешана на стэндзе, чытайце**». Вось так. Мабыць, яна адна з тых, хто прытрымліваецца стэрэатыпу, што па ламбардах ходзяць беднякі або людзі з нячыстым сумленнем.

Мой старэнькі мабільнік, вядома, не прынёс мне добрых грошай. А вось што тычыцца золата...

Разлік цэнаў на каштоўныя металы вызначае Міністэрства фінансаў. А вось на каштоўныя камяні прэйскуранта няма. Таму кошт вырабаў з камянямі разлічваецца ў залежнасці ад вагі каштоўнага металу, з якога зроблена аправа. Нават зубатэхнічныя вырабы могуць прыняць. Галоўнае, каб яны былі адбеленыя і адчышчаныя.

На рукі адразу выдаецца не ўся сума. Дзесьці **ад 30 да 80 %** ацэначнага кошту. Чым даражэйшая рэч, тым больш грошай можна атрымаць на рукі. Па астатнія давядзецца прыйсці на працягу тыдня.

Паколькі я пакідала свой мабільнік назаўсёды, то мне аддалі ўсе грошы адразу. Але папярэдзілі, што калі я пачакаю тры-чатыры дні, то атрымаю на 7 тысяч больш. Толькі ні часу, ні жадання цягнуцца сюды зноў у мяне не было. Таму я пагадзілася на тое, што далі адразу. Ды і затрымліваць чаргу не надта хацелася, было жаданне хутчэй з усім разабрацца. За мной было яшчэ чалавекі чатыры, якім давялося чакаць, пакуль я са сваімі справамі не ўладкуюся. **Закон у такіх установах: заходзіць у ламбард можна толькі па адным.** Яно і зразумела: справа гэта асабістая, больш за тое, з грашыма звязаная.

У XXI стагоддзі ламбарды не страцілі свайго значэння. Яны, як і раней, дапамагаюць людзям вырашаць свае эканамічныя праблемы і з'яўляюцца сур'ёзным фактарам зніжэння сацыяльнай напружанасці ў грамадстве. Асабліва падчас эканамічных праблем. На мой погляд, плюсоў у такога тыпу арганізацый больш, чым мінусаў. І карыстацца іх паслугамі не сорамна, а проста эканамічна выгадна.

**Хутка і беспраблемна грошы атрымлівала Наталля БЕЛЬЧАНКА.**

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.
Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Анатоль СЛАНЕЎСКІ.
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактны тэлефон: 292-44-12.
e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 33.310. Нумар падпісаны ў 19.30.

# ГІДРАМАСАЖ НА СТАРЫМ МЛЫНЕ



Рака Асцёр, Клімавіцкі раён.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ПАМЕРЛА МАЛАДАЯ ЖАНЧЫНА,

**якая стала міжвольнай ахвярай аварыі, што адбылася ў чатыры гадзіны раніцы ў Савецкім раёне г. Гомеля тыдзень таму.**

Нагадаю, тады прарвала трубаправод з гарачай вадой і 50-гадовая дыспетчар каналізацыйна-помпавай станцыі пачала клікаць на дапамогу. У такі ранні час адазвалася дзяўчына, якая знаходзілася на прыпынку грамадскага транспарту побач са станцыяй, вакол якой вяліся рамонтныя работы. 25-гадовая гамяльчанка падышла бліжэй і ў прыцемках нечакана з'ехала ў гарачую ваду ў канаве вакол станцыі. Як паведамілі ў Гомельскім абласным апёкавым цэнтры, у пацярпелай 85 % цела было пашкоджана апёкамі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**

- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- Независимая строительная экспертиза

Для всех форм собственности. Для любых целей

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОСТИ**

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Предприятие как имущественный комплекс ОАО «Гомельский подшипниковый завод»** Краткая характеристика объекта: имущественный комплекс ОАО «Гомельский подшипниковый завод» согласно перечня имущества и имущественных прав, входящих в состав ОАО «Гомельский подшипниковый завод» по состоянию на 01.05.2009 г. и зарегистрировано в Научно-производственном государственном республиканском унитарном предприятии «Национальное кадастровое агенство» (свидетельство о государственной регистрации № 1801 от 18.09.2009 г.) | 6 165 600 000 | 308 280 000 |

**Адрес объектов:** г. Гомель, ул. Шевченко, 27. **Продавец имущества:** управляющий в деле о банкротстве ОАО «Гомельский подшипниковый завод». **Цены указаны с НДС.** Условия продажи: без условий. Шаг аукционных торгов – 5 %, вознаграждение – 6 374 009 бел. руб. Подробная информация о перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в аукционе опубликована в газете «Звязда» № 113 от 12.06.2010 г.

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **До 17.00 8 сентября 2010 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **9 сентября 2010 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиал РУП «Жилкоммунтехника» «Центр «Белтехинвентаризация» |
| **Номер р/с для перечисления залога** | Р/с 3012035310012 в филиале ОАО «БПС-БАНК» по Минской области, код 331, УНП 102353509 |
| **Условие пользования** | Объекты продаются в собственность |

**Дополнительная информация по тел.: (0232) 77 37 27; 77 52 87; 77 52 78 (факс).**

Здароўе нацыі

# У БЕЛАРУСІ РАК ЛЕЧЫЦЦА ЯК У ЕЎРОПЕ ЦІ ЗША

**Рак вылечны. «Невылечным» пакуль застаецца абывацельскі страх перад ім. Усё таму, што абывацель фактычна не ведае пра рэвалюцыйныя змены ў сучаснай анкалогіі. Акрамя таго, факты гібелі людзей ад раку шумна абмяркоўваюцца, а вылечванне — замоўчваецца. На Захадзе, напрыклад, ёсць практыка, калі людзі расказваюць аб сваім вылячэнні ад раку.**

**Напярэдадні юбілейнай даты — 50-годдзя з дня ўтварэння вядучай установы краіны па лячэнні анкалагічных пацыентаў — Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава — намеснік дырэктара па навуковай рабоце Сяргей КРАСНЫ расказвае аб адным з самых складаных і загадкавых захворванняў.**



***— Наколькі істотныя змены адбыліся за апошняе паўстагоддзе ў галіне дыягностыкі і лячэння анкалагічных захворванняў?***

— У медыцыне, напэўна, нішто так дынамічна не развіваецца як анкалогія. Тут кожныя пяць гадоў кардынальна мяняюцца пратаколы і схемы лячэння. Іншыя спецыяльнасці — больш кансерватыўныя. Ва ўсім свеце на развіццё лекавых сродкаў і лячэбна-дыягнастычнае абсталяванне затрачваюцца велізарныя сродкі, таму проста немагчыма параўнаць тое, што ёсць у анкалогіі цяпер, з тым, што было хоць бы дзесяць гадоў назад.

***— У якой ступені рак можна лічыць вылечным?***

— На вялікі жаль, выпадкі, калі нехта памёр ад раку, хутка становяцца вядомымі вялікай колькасці людзей, а факты, калі нехта пралячыўся і выздаравеў, застаюцца вядомымі ў лепшым выпадку самым блізкім хворага. Таму рак для многіх па-ранейшаму звязаны са смерцю. На самай жа справе вылечваецца палова ўсіх хворых, а на 1-2 стадыях — 95 працэнтаў. З такой эфектыўнасцю перамагаецца няшмат хваробаў.

> **«Зоркі» і простыя людзі, у якіх выяўляюць рак, гінуць найперш па прычыне позняга звароту да ўрача.**

***— Аднак віды раку адрозніваюцца па прагнозах...***

— Сапраўды, ёсць лакалізацыі, пры якіх рак паводзіць сябе надта агрэсіўна, і вельмі хутка пасля лячэння з'яўляюцца метастазы. Да такіх пухлін трэба аднесці рак падстраўнікавай залозы ці рак пячоначных пратокаў. У той жа час ёсць пухліны больш спрыяльныя па прагнозе, яны добра лечацца нават на чацвёртай стадыі захворвання. Гэта датычыцца раку прастаты. А пры раку яечка вынікі лячэння будуць нядрэннымі нават пры наяўнасці метастазаў.

***— Што па сілах сучаснай дыягностыцы?***

— Сёння спецыялісты вызначаюць не проста, што за пухліна мае быць, ступень яе злаякаснасці, але і спецыфічныя рэцэптары. Кожная пухліна мае да 10-12 падвідаў і кожны з іх лечыцца па-свойму. Раней падыходы да лячэння пухлін канкрэтнай лакалізацыі былі аднолькавымі. Цяпер неабходна правесці вялікую колькасць дадатковых даследаванняў, вызначыць спецыфічныя рэцэптары пухліны, пасля чаго пачаць уздзеянне на яе канкрэтнымі прэпаратамі. Гэта істотна ўплывае на эфект лячэння.

Наогул асноўнымі метадамі лячэння раку па-ранейшаму застаюцца хірургічны, прамянёвы і лекавы. Апошні ўключае ў сябе як непасрэдна хіміятэрапію, так і гарманальную тэрапію, імунатэрапію і таргетную тэрапію. Такія прэпараты разлічаны на барацьбу з канкрэтным генам. Гэта найбольш сучасны метад лячэння, і ў нас ён таксама прымяняецца.

***— Іншымі словамі, без дыягностыкі, якую забяспечваюць марфолагі і медыцынскія генетыкі, лячэнне — нішто...***

— Нішто без марфалогіі, імунагістахіміі і малекулярнай генетыкі. Усе гэтыя даследаванні праводзяцца па паказаннях на базе нашага цэнтра. У рознай ступені такія магчымасці існуюць ва ўсіх анкалагічных дыспансэрах.

Сёння ў Беларусі высокі ўзровень развіцця анкалогіі, бо нам удалося захаваць сістэму гэтай службы на ўзроўні двух навукова-практычных рэспубліканскіх цэнтраў — нашага і дзіцячага, а таксама 12 абласных, раённых і гарадскіх дыспансэраў. Канкрэтную стадыю захворвання мы лечым зараз так, як гэта робяць у Еўропе ці Злучаных Штатах. Істотнае адрозненне — толькі ў суадносінах ранніх і позніх стадый раку. За мяжой ранніх стадый выяўляецца больш. Адсюль і лепшыя вынікі лячэння.

***— Што нам перашкаджае выяўляць пухліны як мага раней?***

— На ранніх стадыях злаякасная пухліна ніяк не праяўляецца. Чалавека нічога не непакоіць, а ў нас не прынята хадзіць да ўрача ў такім выпадку.

***— Але ж вядома, што рак не ўзнікае на пустым месцы. Паталагічны працэс развіваецца гадамі, у змененай хранічным захворваннем тканцы. Значыць, чалавека павінна было нешта непакоіць...***

— Калі б так было ў ста працэнтах выпадкаў, нам было б намнога прасцей, паколькі большасць хранічна хворых людзей усё ж такі назіраюцца ва ўрача. Аднак бывае, што рак узнікае і ў мінімальна зменена й тканцы. Злаякасная пухліна здольная з'явіцца на фоне дысплазіі шыйкі маткі, пра якую жанчына, якая рэдка наведвае гінеколага, можа і не здагадвацца. Рак можа развіцца і на фоне цалкам здаровай слізістай мачавога пузыра. Вось чаму трэба абследавацца, нават калі няма ніякіх скаргаў.

Часцей за ўсё рак у нас выяўляецца выпадкова. Пацыент звяртаецца да ўрача па прычыне прастуды, здае аналізы і раптам у мачы ў мікраскапічнай колькасці выяўляецца кроў, што можа быць прыкметай раку ныркі ці мачавога пузыра. Дарэчы, калі чалавек сам аднойчы заўважыў у мачы кроў, ён павінен тэрмінова бегчы да ўрача. Бо другі раз падобнае можа назірацца праз некалькі гадоў, калі лячыцца ўжо будзе позна. Нават калі кровацячэнне спынілася, гэта не азначае, што чалавек выздаравеў.

> **Штогод у РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава пралечваецца каля 20 тысяч пацыентаў. Цэнтр займаецца таксама распрацоўкай новых метадаў дыягностыкі і лячэння раку, бярэ ўдзел у даклінічных выпрабаваннях, айчынных і міжнародных.**

***— Для класічнага абследавання, калі нічога не баліць, трэба звяртацца не да анколага, а да звычайнага тэрапеўта па месцы жыхарства. Аднак ці дастаткова адукаваныя ў анкалагічным сэнсе нашы тэрапеўты?***

— Сапраўды, ва ўрачоў на прыёме не такая, як нам, анколагам, хацелася б, адукаванасць у гэтым пытанні. На жаль, дагэтуль анкалогіі ва ўніверсітэце адводзілася ўсяго 56 гадзін, даваліся толькі асновы. Цяпер, праўда, вырашана павялічыць колькасць такіх гадзін.

Задача таго ж тэрапеўта — вызначыць групы рызыкі і даць пацыенту адпаведныя рэкамендацыі. Так, па паказаннях маладым жанчынам можа прызначацца ўльтрагукавое абследаванне малочных залоз, а сталым жанчынам паказана мамаграфія. Мужчынам пасля 50 гадоў раз на год трэба вызначаць прастатспецыфічны антыген. Пры нізкіх значэннях — менш за 1 нг/мл можна рабіць даследаванне і раз у два-тры гады. Курцам неабходна штогод праходзіць флюараграфію лёгкіх і ўльтрагукавое даследаванне мачавога пузыра. Кожны чалавек павінен раз на год здаваць агульны аналіз крыві і аналіз мачы.

***— Якія віды раку можна выявіць па аналізе венознай крыві?***

— На сёння ёсць два прызнаныя маркёры, якія могуць выкарыстоўвацца ў якасці скрынінгу для ўсяго насельніцтва. Гэта вызначэнне прастатспецыфічнага антыгена для выяўлення раку прастаты і выяўленне схаванай крыві ў кале для раку тоўстай кішкі. Аднак ёсць іншы добры агульны паказчык — хуткасць асядання эрытрацытаў. Калі гэты паказчык доўгі час трымаецца на высокіх лічбах — ад 40 і болей, то гэта можа сведчыць пра рак. Аднак абавязкова трэба абследавацца нават пры больш нізкіх значэннях — 20-30. Вельмі ўважліва трэба ставіцца і да ўзроўню гемаглабіну. Анемічны стан таксама можа назірацца пры пухлінах.

***— Што найбольш актыўна спрыяе развіццю анкалагічных захворванняў?***

— У першую чаргу шкодныя звычкі. З курэннем звязана да 98 працэнтаў раку лёгкага. Тое ж можна сказаць і пра рак мачавога пузыра, паколькі прадукты гарэння тытуню выводзяцца з мачой. Пухлінам рознай лакалізацыі спрыяе злоўжыванне алкаголем у спалучэнні з курэннем. Фаст-фуд, вялікая колькасць смажанага-вэнджанага і малая колькасць вугляводаў расліннага паходжання ў харчаванні ўплывае перш-наперш на здароўе страўніка і кішэчніка. Шэраг пухлін, напрыклад, рак цела маткі звязаны з лішняй вагой. Павялічвае колькасць выпадкаў раку і дрэнная экалогія, непасрэднае таксічнае ўздзеянне на арганізм шкодных хімічных рэчываў.

***— Што кожны з нас павінен зрабіць для самаабароны?***

— Для кожнага чалавека могуць быць свае рэкамендацыі. Але ў цэлым трэба адмовіцца ад шкодных звычак, на шкоднай вытворчасці карыстацца неабходнымі сродкамі самаабароны, ужываць больш гародніны і фруктаў, сур'ёзна ставіцца да лячэння передпухлінных станаў. Як мы гаварылі вышэй, раку папярэднічаюць іншыя хваробы, і яны на сёння добра вядомыя. Калі ж чалавека пралячылі ад раку, то яго задача — своечасова абследавацца і выконваць усё, што яму прызначае спецыяліст. Гэта дапаможа не дапусціць рэцыдыў або выявіць яго як мага раней.

***— А што не трэба рабіць у выпадку выяўлення раку?***

— Не трэба спадзявацца на атрутныя расліны. Шэраг з іх, той жа грыб чага, валодаюць супрацьпухліннымі вартасцямі, але не даюць вылячэння. Такія расліны выкарыстоўваюцца ў якасці суправаджэння асноўнага курса і толькі па прызначэнні ўрача. У іншым выпадку такая практыка прыводзіць да моцнага атручэння, пашкоджання здаровых тканак, і ў першую чаргу тых, што хутка размнажаюцца — палавых клетак, клетак крыві і касцявога мозгу. Калі б грыбамі вясёлка, чага можна было вылечыць рак, ніхто б не траціў на распрацоўку супрацьпухлінных прэпаратаў мільёны долараў.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

**МОГИЛЕВСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ**

**Аукцион состоится 3 сентября 2010 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний**

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни **с 08.00 до 17.00.** Последний день приема заявлений – **30.08.2010 года** до 17.00.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Условия проведения аукциона – **наличие не менее двух участников.**

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют в сроки, указанные в извещении:

а) квитанции о внесении задатка на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета **№3642017441709** в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж); б) документ, удостоверяющий личность **(паспорт)** покупателя, а в случае участия в аукционе его представителя – **паспорт и нотариально заверенную доверенность.**

Порядок осмотра на местности земельных участков: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: строительство инженерных коммуникаций будет осуществлено в соответствии с ПСД за счет бюджета города. Продажа земельных участков производится без изменения целевого назначения.

**Победитель аукциона обязан:** в течение десяти рабочих дней после принятия решения о предоставлении земельного участка в частную собственность внести плату за земельный участок (задаток засчитывается при внесении платы); возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения. Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона (на всех победителей) составляет 4 миллиона рублей.

| №№ лота | Адрес земельного участка | Площадь, га | Кадастровый номер | Стоимость землеустроительного дела (руб.) | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| № 1 | улица Кленовая № 10 по генплану | 0,0900 | 740100000007004905 | 1 130 452 | 13 550 000 | 1 220 000 |
| № 2 | улица Кленовая № 15 по генплану | 0,0900 | 740100000007004904 | 1 461 131 | 13 550 000 | 1 220 000 |
| № 3 | улица Кленовая № 21 по генплану | 0,0900 | 740100000007004906 | 1 461 131 | 13 550 000 | 1 220 000 |

**Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.**

Погляд

# КОЛЬКІ РАССТРАЛЯНЫХ БЕЛАРУСАЎ ПАХАВАНА Ў КАТЫНІ?

## Карэспандэнт «Звязды» наведаў мемарыял пад Смаленскам, дзе супрацоўнікі НКУС СССР у 1940 годзе расстралялі тысячы польскіх афіцэраў

**5 сакавіка 1940 года народны камісар унутраных спраў СССР Лаўрэнцій Берыя напісаў Сталіну сакрэтную запіску, на якой пазней паставяць пазнакі «за» і подпісы таварыш Кагановіч, таварыш Калінін, таварышы Молатаў, Варашылаў і Мікаян. У запісцы, калі коратка, была канкрэтная прапанова: расстраляць каля 25 тысяч польскіх афіцэраў і іншых грамадзян, якія знаходзяцца ў лагерах для ваеннапалонных. Прапанова была ўхваленая, а значная частка яе была выкананая ў Катыні — лесе пад Смаленскам.**

Увесь час пасля гэтых падзей Катынская трагедыя выкарыстоўвалася як інструмент прапаганды. Яшчэ ў часе вайны камуністы сцвярджалі, што ў Катыні расстрэльвалі фашысты. А фашысты на акупаваных тэрыторыях, наадварот, распаўсюджвалі інфармацыю пра савецкае злачынства. Цяпер, калі адкрыліся многія архівы, дакладна вядома: Катынскае злачынства здзейснілі бальшавікі. Прэзідэнт Расіі Ельцын у свой час публічна папрасіў прабачэння ў польскага народа...

Многія беларусы падрабязна даведаліся пра Катынскую трагедыю толькі ў красавіку гэтага года, калі па Першым нацыянальным тэлеканале быў паказаны фільм «Катынь» польскага рэжысёра Анджэя Вайды. За некалькі дзён да гэтага пад Смаленскам, як вы памятаеце, разбіўся самалёт з польскім прэзідэнтам Лехам Качыньскім і яшчэ 95 чыноўнікамі і грамадскімі дзеячамі... Яны ляцелі ўшанаваць памяць расстраляных у Катыні.

Многія людзі, асабліва пажылыя, дагэтуль не вераць у злачынствы сталінскага рэжыму. Мая 79-гадовая бабуля гатовая біцца за «бацьку народаў Сталіна, які выйграў вайну». Яна і чуць не хоча, што Сталін — адзін з найвялікшых ліхадзеяў XX стагоддзя, па віне якога загінулі мільёны невінаватых савецкіх грамадзян. Гэта была вайна са сваім народам...

У мемарыяле «Катынь» я пабываў 23 жніўня — у Міжнародны дзень памяці ахвяраў рэпрэсій. У гэтую жалобную дату экскурсію ў Катынь арганізавала Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў, яго секцыя «Мемарыял». У часе выправы было цікава пачуць думку супрацоўнікаў мемарыяла. На пытанне «Звязды» адказала **намесніца дырэктара па навуковай працы мемарыяла «Катынь»**





**Галіна Анатольеўна АНДРЭЕНКАВА.**

### «У людзях дагэтуль жыве савецкі ген страху...»

***— Галіна Анатольеўна, не так даўно па расійскім тэлебачанні прайшоў дакументальны прапагандысцкі фільм, дзе зноў сцвярджаецца, што польскіх афіцэраў у Катыні забівалі не НКУСаўцы, а фашысты... А якой версіі прытрымліваецеся вы, супрацоўнікі мемарыяла?***

— Якія тут могуць быць версіі?! Зразумела, што расстрэльвалі бальшавікі, супрацоўнікі НКУС. Гэта, здаецца, ужо цалкам даказана. Мы маем 4 тамы дакументаў, якія выдалі палякі, і 2 тамы дакументаў, якія выдала наша расійская Акадэмія Навук. Да таго ж, ёсць сведчанні відавочцаў. Хоць навука звычайна ставіцца да сведкаў дужа асцярожна... Аднак ёсць у нас і сведчанне такога Пятра Клімава. Ён, вядома, сам не ўдзельнічаў у гэтых расстрэлах, аднак працаваў у органах НКУС. І засведчыў, што быў тут увесну 1940 года... Таксама мы сабралі шмат сведчанняў мясцовых жыхароў, якія бачылі, як на станцыю Гнёздава прывозілі польскіх афіцэраў. Гэта кідалася ў вочы — бо тут людзі жылі за жалезнай заслонай, таму вайсковую форму чужаземцаў разглядалі з цікавасцю. Ніякай гаворкі, што тут расстрэльвалі немцы, быць не можа...

***— А з мясцовых шмат засталося відавочцаў тых падзей?***

— Так, мясцовых жыхароў мы апытваем ад часу стварэння мемарыяла. Спачатку людзі, зразумела, былі вельмі асцярожныя. Зараз яны ўжо ўсе вельмі старыя, шмат хто хворы, некаторыя ўжо не падымаюцца з ложка. Яны сведчылі нам, што тут польскіх афіцэраў стралялі менавіта бальшавікі. Але



ведаеце, гэты савецкі ген страху жыве ў людзях і цяпер. Літаральна ўвесну мне патэлефанаваў мужчына і сказаў: «Галіна Анатольеўна, я хачу распавесці вам некаторыя дэталі, якія бачыў яшчэ хлопчыкам у Катыні. Але калі будзеце публікаваць гэта, калі ласка, не называйце майго прозвішча, бо мой бацька быў расстраляны ў 1938 годзе...» Уяўляеце, ён дагэтуль баіцца, што нешта можа вярнуцца!.. І ён расказаў, як на станцыю Гнёздава прыходзілі цягнікі з польскімі афіцэрамі, апісаў іх форму... На станцыі была крама, і людзі хадзілі туды, бачылі, як прывозілі гэтых афіцэраў... Да таго ж, у 1943 годзе немцы, калі праводзілі раскопкі, арганізавалі сюды экскурсіі, каб паказаць злачынства сталінскага рэжыму... Хлопчыкам, якія дапамагалі ў раскопках, давалі цукеркі, дарослым — шклянку гарэлкі і паўбуханкі хлеба. І гэты чалавек таксама быў на гэтых раскопках, бачыў гэтыя трупы...

***— Прыхільнікі версіі, што ў Катыні стралялі не бальшавікі, а немцы, маюць аргумент: тут знойдзеныя пераважна нямецкія кулі...***

— Гэта таксама даўно вядома і пацверджана дакументамі: НКУСаўцы сапраўды расстрэльвалі зняволеных з нямецкай зброі, якая была замоўленая знарок для гэтага. Бо яна больш надзейная! Уявіце толькі: некаторыя каты расстрэльвалі да 200 чалавек за змену! Савецкая зброя проста не вытрымлівала такога. Пра нямецкую зброю нам сведчыў і Токараў, колішні начальнік УНКУС па тагачаснай Калінінскай вобласці... Таксама я сустракалася з намеснікам галоўнага пракурора нашай вобласці, які ўдзельнічаў у следчым эксперыменце ў Катыні. Ён сам бачыў у архіве дакумент, дзе дакладна было напісана: вясной 1940 года ў Смаленск была прывезеная партыя нямецкай зброі. Нямецкая зброя не перагравалася і не давала збояў...

***— Галіна Анатольеўна, ці больш людзей стала наведваць мемарыял «Катынь» пасля таго, як 10 красавіка тут разбіўся самалёт, дзе знаходзіўся польскі прэзідэнт і кіруючая эліта краіны?***

— Натуральна, гэтая трагедыя прыцягнула да нашага мемарыяла дадатковую ўвагу. Штогод у нас ёсць каля 30 тысяч наведнікаў, сёлета, мяркую, будзе каля 60 тысяч. Найбольш, зразумела, едуць расіяне і палякі. Важна, што і беларусы едуць да нас усё больш — бо вашых суайчыннікаў тут пахавана вельмі шмат...

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**
**Фота аўтара.**
*Катынь—Мінск.*

**P.S.** *У Катыні сярод імёнаў расстраляных і месцаў іх нараджэння сапраўды можна знайсці шмат знаёмых гарадоў і мястэчак: Гродна, Мінск, Жлобін, Івянец, Віцебск... Беларускі гісторык Ігар Кузняцоў кажа, што, паводле ягоных падлікаў, з 4421 пахаванай ахвяры — 1221 чалавек мае беларускае паходжанне. І гэта — не канчатковая лічба. А гэта значыць, што Катынь — не толькі польскае, але і беларускае месца ўшанавання памяці ахвяраў сталінскіх рэпрэсій.*

### ТОЛЬКІ ЛІЧБЫ

Афіцыйныя дакументы ў мемарыяле «Катынь» сведчаць, што тэрмін «катынскае злачынства» ўбірае ў сябе расстрэл у красавіку-маі 1940 года амаль 22 тысячы польскіх грамадзян, якія ўтрымліваліся ў трох турмах НКУС СССР. З 22 тысяч — 14 552 польскія афіцэры. З іх 4421 чалавек расстраляны ў Катыні, 6311 расстраляны ў Калініне і пахаваныя ў Медным, 3820 чалавек пахаваныя ў Харкаве.

Яшчэ 7305 чалавек былі расстраляныя ва Украіне і Беларусі. Пахаваныя ў Кіеве, Харкаве, Херсоне і Мінску.

Найбольш вядомыя месцы пахавання ахвяраў злачынстваў — урочышча Курапаты і Трасцянец пад Мінскам. Магчыма, тут ляжаць і «катынскія» ахвяры.

Мемарыял «Катынь» адкрыты 28 ліпеня 2000 года, фінансаванне будаўніцтва здзейснілі польскі і расійскі бакі.





Смачнае — карысна!

# Усё пачынаецца з яйка

**З-за аптымальнага амінакіслотнага складу і практычна поўнай засваяльнасці бялок курынага яйка прыняты за эталон біялагічнай каштоўнасці для чалавека. Гэта азначае, што любы жывёльны або раслінны бялок па ўтрыманні ў ім амінакіслот ацэньваюць у параўнанні з бялком курынага яйка.**

Хоць і існуе меркаванне, што ўжыванне яек шкодзіць здароўю, аднак большасць аргументаў праціўнікаў яечнага рацыёну навукоўцы прызнаюць памылкамі.

Курынае яйка — натуральны прадукт, створаны самой прыродай для здаровага харчавання. **На думку навукоўцаў, два яйкі ўсмятку або яечня на сняданак здольныя забяспечыць актыўную дзейнасць чалавека да абеду. Пры гэтым ён атрымае палову сутачнай нормы найважнейшых вітамінаў A, D і E, шэрагу вітамінаў групы B і іншых карысных элементаў.** Курыныя яйкі даюць адчуванне сытасці, забяспечваюць арганізм вялікай колькасцю пажыўных рэчываў і пры гэтым засцерагаюць ад залішняй вагі.

Дзякуючы аптымальнаму спалучэнню немалых колькасцяў жалеза, медзі, марганцу, кобальту і іншых рэчываў у курыным яйку, яно можа быць сродкам прафілактыкі і лячэння анеміі ў людзей рознага ўзросту. Цяжка таксама пераацаніць карысць фосфару курынага яйка для нервовай сістэмы чалавека.

**Сыры яечны бялок зніжае кіслотнасць страўнікавага змесціва** больш эфектыўна, чым некаторыя аптэчныя сродкі, прызначаныя для гэтай мэты. Таму бялок дабраякаснага яйка іншы раз карысна з'ядаць тым, каго непакоіць пякотка, болі ў падлыжачнай вобласці.

**Жаўток курынага яйка валодае ўнікальнай уласцівасцю выклікаць скарачэнні жоўцевага пузыра**, стымулюючы адток жоўці ў кішэчнік, што паляпшае перыстальтыку і спрыяе засваенню тлушчаў.

Усходняя медыцына рэкамендуе ўжываць курыныя яйкі пры розных ангінах, ахрыпласці голасу, сухім кашлі, як пажыўны прадукт пры сухотах. Паравыя амлеты з бялкоў рэкамендуюцца для аднаўлення арганізма пасля цяжкіх хваробаў, пры агульнай слабасці.

**Аднак тым, у каго праблемы з печанню, непажадана есці яйкі смажаныя або з маянэзам (ці іншым соусам). Ужыванне яечных жаўткоў таксама абмяжоўваюць пры халецыстыце і жоўцекамянёвай хваробе, цукровым дыябеце і атэрасклерозе.**

Важна гатаваць яйкі пры аптымальнай тэмпературы на працягу невялікага часу (не больш за 10 хвілін). Яйкі ўсмятку засвойваюцца лягчэй, чым звараныя ўкрутую або сырыя. Іх засваяльнасць павышаецца таксама пры ўзбіванні або расціранні з цукрам.

**ТЭХНІКА БЯСПЕКІ**

- Яйкі перад ужываннем пажадана прамыць — гэта знізіць магчымасць пападання шкодных мікробаў са шкарлупіны ў ежу.
- У мэтах папярэджання інфекцый (сальманелёз) пажадана выкарыстоўваць яйкі пасля цеплавой апрацоўкі. Яечню для лепшага прагрэву трэба гатаваць пад накрыўкай.
- Тэрмін захоўвання яек у халадзільніку — 30 сутак, пры пакаёвай тэмпературы — 12 сутак. Дарэчы, найлепшымі харчовымі якасцямі валодаюць яйкі, якія захоўваліся не больш за 5 дзён, не лічачы дня, калі яны былі знесеныя. Такія яйкі называюць дыетычнымі.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

ЗВЯЗДА 25 жніўня 2010 г.

Вадзіцель-выпрабавальнік Віталь ГАГАЛУШКА на спецыяльнай пляцоўцы займаецца абкаткай новай тэхнікі.



# «КАМБАЙНЫ НАШЫЯ ЎСЁ БОЛЬШ СТАНОВЯЦЦА БЕЛАРУСКІМІ»



Інжынер па якасці Вераніка БУДЗЕВІЧ прадстаўляе прадукцыю свайго прадпрыемства.

**Калі непрадузята, аб'ектыўна ацэньваць тое, што здзейсніў гэты калектыў у жорсткіх умовах абвалу эканомікі на тэрыторыі былога СССР, а ён на часе супаў з уступленнем у не менш жорсткія, нават бязлітасныя рынкавыя стасункі, то гэта — працоўны подзвіг. Лідчане знайшлі новую для сябе нішу і на базе невялікага аўтарамонтнага прадпрыемства (аднаго з правінцыйных філіялаў завода імя Ліхачова), які на той час не меў рэальных перспектыў, стварылі спачатку магутнасці па зборцы збожжаўборачных камбайнаў з імпартных вузлоў па ліцэнзіі знакамітай фірмы «Кейс», а таксама выпуску іншай даволі дэфіцытнай сельскагаспадарчай тэхнікі. А цяпер ад простай зборкі «стэпавых караблёў» усё больш пераходзяць да іх сталай вытворчасці — на аснове ў пераважнай большасці айчынных камплектуючых. У выніку па магутнасці рухавіка, эканамічнасці, прадукцыйнасці яны пераўзыходзяць расійскія «Доны» (і не толькі «Доны»). Захавалі калектыў, прапанавалі работу новым і новым людзям — ужо за адно гэта зямны паклон. І істотна падтрымалі айчынных земляробаў, далі ім магчымасць выбару.**

**Дарэчы, на вытворчасць свайго новага збожжаўборачнага камбайна «Ліда-1600» і яшчэ аднай супермашыны — шматфункцыянальнага глебаапрацоўчага пасяўнога агрэгата не затрацілі ні капейкі бюджэтных сродкаў, за што асобны дзякуй.**

**Зразумела, пастаўляючы сучасную, надзейную і недарагую машыну, стварылі калегам — сваім і замежным — пэўную канкурэнцыю, але такі адзін з асноўных законаў рынку. І Прэзідэнт падчас наведвання маладога камбайнабудаўнічага завода добра разумеў перавагі канкурэнцыі і перавагі магчымасці выбару, калі бласлаўляў лідчан на творчы пошук. Бо ў эканоміцы няма горшай бяды, чым манапалізм, пра што яшчэ раз сведчыць сумны вопыт суседзяў.**

**Дзякуючы падтрымцы кіраўніка дзяржавы прадпрыемства да гэтага часу не «заштурхалі», яно развіваецца і асвойвае новыя гарызонты. Ужо летась у гэты час мела ў актыве 25 найменняў і тыпапамераў сельскагаспадарчых машын, прычым у 10 з іх няма аналагаў у СНД. Пры ўсім гэтым калектыў па-ранейшаму ўважліва прыслухоўваецца і ўлічвае сяброўскую крытыку калег і іншых па шчыраму зацікаўленых бакоў, пажаданні спажыўцоў сваёй тэхнікі — земляробаў, а таксама найноўшыя тэндэнцыі ў камбайнабудаванні.**

**На працягу многіх гадоў «Звязда» ўважліва сочыць за развіццём параўнальна новай для Беларусі галіны — камбайнабудавання: як на прыкладзе «Гомсельмаша», так і «Лідаграпраммаша», пра які сёння размова. Стараемся аказваць гомельскім і лідскім наватарам усялякую інфармацыйную падтрымку. Каб беларускі селянін не шукаў па звычцы замежныя машыны, а ўсё больш давяраў сваім. І калі з Ліды патэлефанавалі і сказалі, што ёсць навіны, мы палічылі сваім абавязкам пазнаёміць з імі шырокага чытача.**

**Тым больш што адна з асноўных навінаў — вельмі своечасовая: якраз напярэдадні сезона ўборкі «другога хлеба» ў гаспадаркі краіны пачалася пастаўка бульбаўборачнага камбайна новай мадыфікацыі.**



Намеснік дырэктара па маркетынгу і збыце Андрэй ЗАХАРЧУК прадэманстраваў толькі частку дыпломаў, якімі прадукцыя прадпрыемства адзначана на буйных выставах і кірмашах, у тым ліку міжнародных.

## «СУМЕСНЫ НЯМЕЦКА-БЕЛАРУСКІ БУЛЬБАЎБОРАЧНЫ КАМБАЙН — ВЕЛЬМІ СУЧАСНЫ»

**Слова — галоўнаму інжынеру ААТ «Лідаграпраммаш» Уладзіміру ЛІТВІНУ.**

— Увесь апошні год мы займаліся як удасканаленнем той тэхнікі, што была пастаўлена на вытворчы канвеер раней, так і распрацоўкай і асваеннем новай. У першую чаргу хачу сказаць пра бульбаўборачны камбайн — двухрадны, з бакавым падкопам, яго мы сёлета паставілі на паток сумесна з вядучай сусветнай фірмай па вытворчасці бульбаўборачнай і кармавой тэхнікі «Грыме» з Германіі. Камбайн атрымаўся абсалютна сучасным, з дастаткова высокай прадукцыйнасцю, якая дазваляе капаць 0,9 — 1,3 гектара ў гадзіну, а гэта 9 гектараў у змену. Умяшчальнасць бункера 6 тон. Перавага бакавога падкопу ў тым, што трактар, да якога чапляецца камбайн, ідзе па ўзараным полі, дзе ўжо няма клубняў. Гэта значыць, клубні не пашкоджваюцца. Такіх машын у Беларусі ніхто яшчэ не выпускаў.

Камбайн вырабляем у дзвюх версіях: для чыстых палёў і для палёў, багата засмечаных каменнем і грудамі зямлі. А такіх палеткаў у краіне хапае. Машына ачышчае клубні і падае іх у бункер-накапляльнік з наступнай выгрузкай.

Па даручэнні Мінсельгаспрода мы разам з бельгійскай фірмай «Уніён» распрацоўваем таксама перспектыўную льноўборачную тэхніку — двухпаточны льноўборачны камбайн (а гэта машына арыгінальная нават па еўрапейскіх маштабах), а таксама двухпаточную церабілку і пераварочвальнік лёну. Яны будуць запатрабаваныя ў ільнаводчых гаспадарках. На падыходзе — новы высокапрадукцыйны апырсквальнік.

З іншых навінаў варта адзначыць тую, што наш збожжаўборачны камбайн «Ліда-1300» быў на буйной спецыялізаванай выставе ў Сербіі, дзе, дарэчы, удзельнічаў ва ўборачнай кампаніі і адначасова праходзіў выпрабаванні на СЕ-маркіроўку, якая адкрывае шлях еўрапейскаму экспарту. Цудоўна зарэкамендаваў сябе, усе вузлы і агрэгаты адпрацавалі належным чынам, што дало нам магчымасць атрымаць права на маркіроўку СЕ-знакам і ўжо зараз весці плённыя перамовы і заключаць дагаворы на пастаўку «Ліды-1300» у еўрапейскія краіны. У прыватнасці, у Славакію.

На выстаўцы ў Сербіі не выпадкова быў праяўлены такі інтарэс да «Ліды-1300» — прадукцыйнасць нармальная для тых жа фермерскіх гаспадарак, цана прымальная.

Справа ў тым, што еўрапейскі рынак усё больш паварочваецца да недарагіх камбайнаў. Так што новыя гарызонты ў Еўропе становяцца цалкам рэальнымі. Значыць, будзем зарабляць для Беларусі валюту, на што пастаянна арыентуе Прэзідэнт.

Як вядома, яшчэ раней мы распачалі пастаўку сваёй збожжаўборачнай тэхнікі ў Казахстан, на Украіну, у Расію.

Тут патрэбна патлумачыць. За апошнія гады камбайнавы парк нашай краіны практычна абнавіўся — дзякуючы таму, што ў Беларусі працуюць два камбайнабудаўнічыя заводы. І мы ўсё часцей ідзём на міжнародныя рынкі, на той жа рынак Расіі. Прапануем гаспадаркам «Ліду-1300» на выпрабаванні, яна абсалютна нармальна сябе паказвае (у тым ліку і на нядаўніх «параўнаўчых выступленнях» у Благавешчанску, на якіх абыйшла «Доны», «Класы» і «Нівы») і раскупляецца. А чаму б і не? Страты збожжа мінімальныя, а суадносіны цаны і якасці прываблiваюць. Яна ў два разы больш танная за «Лексіён».

Спадзяёмся, што высокаўраджайныя рэгіёны — Стаўраполле, Кубань праявяць цікавасць і да больш магутнай машыны «Ліда-1600».

Жадаючы замацавацца на расійскім рынку, ствараем у суседзяў сумесныя вытворчасці — у Омскай вобласці, на базе прадпрыемства, якое яшчэ ў гады вайны выпускала жняяркі і мае вопыт. А таксама ва Удмуртыі, на Далёкім Усходзе. Зацікавіліся Паўночна-заходнім рэгіёнам, з цэнтрам у Кіраве (былая Вятка). Прыязджалі іх прадстаўнікі, размова ідзе пра пастаўкі туды пнеўматычных сеялак, бо ў Расіі гэта дэфіцыт, такіх заводаў практычна няма. Яны зацікавіліся таксама і нашымі глебаапрацоўчымі пасяўнымі агрэгатамі.

Зараз прапрацоўваем пытанне аб стварэнні сумеснай вытворчасці ў Казахстане, там таксама сур'ёзны рынак.

Што датычыць больш магутнай машыны «Ліда-1600», якая ўвабрала ў сябе лепшыя ўласцівасці «Ліды-1300» з удасканаленнем цэлага шэрагу механізмаў і сістэм, то, плануючы прапанаваць яе на рынках суседняй Расіі ўжо сёлета, адначасова рыхтуем да еўрапейскага «экзамену». Гэта ўніверсальная машына, здольная ўбіраць усе збожжавыя і зернебабовыя культуры, а таксама дробнанасенныя культуры (напрыклад, рапс, насенныя культур) і кукурузу. Магутнасць рухавіка 325 конскіх сіл. А дзякуючы ўдасканаленай чатырохбарабаннай малацільна-сепарыруючай сістэме забяспечваецца поўны абмалот. Пропускная здольнасць — да 14 кг хлебнай масы ў секунду.

Летась на Паўночна-Заходняй МІС пад Санкт-Пецярбургам прайшоў выпрабаванні наш глебаапрацоўчы пасяўны агрэгат АПП-6 «Д» («Дыскатар»), атрымаў сертыфікат адпаведнасці, і мы таксама збіраемся гандляваць ім у Расіі. Глебы там складаныя, шмат камення, і наш «Дыскатар» з яго рабочымі органамі — дыскамі — цудоўна адаптаваны да такіх глебаў.

Зараз нам стала цесна ў старых сценах, таму распрацоўваем інвестыцыйны план па тэхнічным пераўзбраенні, павелічэнні магутнасцяў з адначасовым пашырэннем вытворчых плошчаў, без чаго не абыдзешся. Прадугледжваецца будаўніцтва новых цэхаў і пашырэнне наяўных. Наменклатура прадукцыі пастаянна пашыраецца, і новы мадэльны рад сапраўды не ўпісваецца ў старыя сцены машынарамонтнага завода. Тым больш што пастаянна набываем новае высокапрадукцыйнае абсталяванне. Яно дазваляе ажыццяўляць і палітыку далейшага энергазберажэння.



Цэх зборкі камбайнаў.



— Кабіна новага камбайна прасторная і камфортная, — сведчыць вадзіцель-выпрабавальнік Сяргей ЦАРЭВІЧ.



Слесар Алег ГОВАР заняты зборкай кабіны збожжакамбайна.

## «ТВОРЧЫ ПОШУК ПРАЦЯГВАЕЦЦА»

**Гутарым з галоўным канструктарам Уладзімірам ЯНЧАНКАМ.**

***— Прайшло дзесяць месяцаў з дня мінулай публікацыі. Што ўдалося за гэты час, Уладзімір Мікалаевіч? У першую чаргу — па імпартазамяшчэнні.***

— Калі гаварыць пра галоўную нашу прадукцыю, збожжаўборачныя камбайны, то зроблена нямала. Ужо зараз яны на 83 працэнты — беларускія. Самі вырабляем корпус машыны, шнэкі, нахільныя камеры, бункеры, транспартную цялежку для жняяркі і шмат чаго іншага. А з гэтага года робім нават кабіны для камбайна «Ліда-1600», з уласных камплектуючых. Адзінае, што падключалі калег з «Ліпласта — СПб» — гэта мясцовая, але сумесная з Санкт-Пецярбургам, кампанія.

Адмовіліся ад закупак імпартных пакрышак для пярэдніх колаў, па нашым заказе іх распрацавала і зараз пастаўляе «Белшына». І ўзялі ў бабруйчан доследную партыю задніх пакрышак. Плануем у наступным годзе цалкам перайсці на заднія бабруйскія пакрышкі, а гэта даволі сур'ёзная імпартная складовая.

Зрабілі доследныя пастаўкі айчыннай гідраўлікі на размеркавальнікі нізкага і высокага ціску для збожжаўборачных камбайнаў. Практычна ўсе 100 працэнтаў гідрацыліндраў — кобрынскія. Карданныя валы для прывада жняяркі — гродзенскага завода «Белкард». Заднія масты бяром у «Гомсельмаша» і з ім жа адпрацоўваем канструкцыю пярэдняга моста камбайна. Але маючы на ўвазе дыверсіфікацыю вытворчасці, асвоілі і выпуск уласных пярэдніх мастоў разам з фірмай «Клаас».

Па «Лідзе-1300» пашырылі наменклатуру па гідраўліцы, шырока выкарыстоўваем прадукцыю і «Белкарда», і кобрынскага прадпрыемства па вытворчасці гідрацыліндраў.

***— Давайце вернемся да 1600-га. Гэта параўнальна новая для вас мадэль, летась яна выпускалася толькі першы год. Вы яе неяк удасканальвалі з улікам леташняй уборкі?***

— Зрабілі больш ёмістым збожжавы бункер, ён наогул атрымаўся больш тэхналагічным. Па прапановах гаспадарак-спажыўцоў дапрацавалі саломаздрабляльнік. Мы цалкам перапрацавалі кампаноўку кабіны і кандыцыянера, а гэта было набалелае пытанне. У выніку сёлета падчас уборкі адмоў кандыцыянераў не зафіксавана.

Узмацнілі некаторыя вузлы. І сумесна з «Ліпластам — СПб» дапрацавалі абліцоўку камбайнаў такім чынам, каб яна была і прыгожай, і практычнай — цяпер яе проста і манціраваць, і рэгуляваць пры ўстаноўцы.

А пры падтрымцы фірмы «Клаас» сёлета пачалі самі вырабляць бэльку пярэдняга моста і тым самым яшчэ больш знізілі долю імпарту. І ў выніку ўзяліся за выпуск пярэдніх мастоў, пра што я ўжо ўпамінаў. Так што камбайны нашы ўсё больш становяцца беларускімі.

Можна назваць шмат іншых прыкладаў, калі па прапанове спажыўцоў мы ўдасканалілі быццам бы і дробныя вузлы, дэталі, функцыі, але ўсё гэта працуе на галоўную мэту — давядзенне машыны да высокатэхналагічных параметраў. У выніку машына стала больш рамонтапрыгоднай, надзейнай, яе лягчэй абслугоўваць. Усяго ўдасканалена каля 45 такіх невялікіх, але важных пазіцый. Так што творчая думка не стаіць на месцы. Нашы канструктары зараз працуюць і над тым, каб лідскія камбайны ўпэўнена адчувалі сябе на пераўвільготненых землях.

## АДМОЎ ТЭХНІКІ СТАНОВІЦЦА МЕНШ,

**запэўніў нас начальнік аддзела ўкаранення сістэмы менеджменту якасці Дзяніс САМАРДАК.**

— Наш аддзел аказвае метадычнае кіраўніцтва даволі складаным працэсам кіравання якасцю прадукцыі на заводзе. Займаемся падтрымкай у рабочым стане і ўдасканаленнем сістэмы менеджменту якасці. Яна сертыфікаваная ў адпаведнасці з СТБ ISO 2001 — 2009 года і працуе даволі эфектыўна. Аб гэтым гаворыць хоць бы той факт, што працэнт сертыфікацыі прадукцыі — 99,9. З году ў год назіраецца станоўчая дынаміка па зніжэнні адмоў тэхнікі ў перыяд эксплуатацыі.

Напрыклад, па «Ліда-1300» адмовы практычна зведзены да нуля, машына цалкам адпрацаваная. Узровень дэфектнасці на ёй раней быў 0,44, цяпер наогул зведзены да 0,068.

Па «Лідзе-1600» таксама ў гэтым сэнсе заўважны прагрэс, адмоў сёлета на трэць менш, чым летась. Мерапрыемствы, якія мы выканалі па выніках першай для яе леташняй уборкі, аказаліся надзвычай эфектыўнымі, і камбайны, што выйшлі на палі ў 2010 годзе, пазбаўлены недахопаў, якія назіраліся ў 2009-м. Узровень дэфектнасці з 0,72 зніжаны да 0,46 (трыццаць працэнтаў мінус).

Не хачу нікога пакрыўдзіць, але асноўны працэнт адмоў прыходзіцца на пакупныя камплектныя вырабы. Пры гэтым варта сказаць, што сістэмных адмоў няма: недзе падвёў падшыпнік ці гідрацыліндр, але з гэтым можна справіцца хутка.

Камбайны ў гэтай уборачнай кампаніі адпрацавалі паспяхова, пра што сведчаць і намалоты. Многія ўжо на момант нашай сустрэчы намалацілі больш за тысячу тон збожжа — у СВК «Зарэчны-Агра», напрыклад. У СВК «Пагранічны», што таксама на Гродзеншчыне.

Мы вядзём маніторынг, параўноўваем, як спрацавалі нашы камбайны ў параўнанні з іншымі аналагамі — айчыннымі і замежнымі. Цікавімся, хто працуе на нашых камбайнах — ад гэтага залежыць шмат што. І вялікую ўвагу надаём навучанню механізатараў. Камбайн — найскладанейшая машына, патрабуе наладкі, рэгуліроўкі. І каб механізатар не забываў прыёмы эксплуатацыі, нейкія нюансы, якія могуць з'явіцца ў яе ходзе, кожную вясну праводзім абучэнне.

Сёлета стварылі дзве дадатковыя брыгады, праехалі па гаспадарках, на рабочых месцах паказалі, як і што патрэбна зрабіць, каб уборка праходзіла эфектыўна, асабліва з улікам умоў надвор'я сёлетняга года.

Займаемся пасляпрадажным абслугоўваннем усёй тэхнікі, якую рэалізавалі, у абласцях у гэтым кірунку працуюць дылерскія цэнтры. Ніводная адзінка тэхнікі без гарантыйнага і паслягарантыйнага сэрвіснага абслугоўвання не застаецца. На перыяд уборачнай кампаніі ствараецца да 20 брыгад па абслугоўванні. Любую адмову мы ліквідуем на працягу аднаго дня. А зараз наогул стараемся, каб адлік ішоў не на дні, а на гадзіны.

Спажыўцы нашай прадукцыі могуць карыстацца нашым афіцыйным вэб-сайтам, на якім змешчана ўся інфармацыя, што можа іх зацікавіць у працэсе эксплуатацыі лідскай тэхнікі. Скажам, у раздзеле «Сэрвіснае абслугоўванне» даюцца адрасы дылерскіх цэнтраў з тэлефонамі і прозвішчамі іх кіраўнікоў, адрасы і кантактныя тэлефоны гарантыйных службаў пастаўшчыкоў важнейшых вузлоў і агрэгатаў камбайна.



Слесары-зборшчыкі Павел КОРС і Віктар БРАНКОЎСКІ.

## АБ'ЁМЫ ВЫТВОРЧАСЦІ ЎЗРАСЛІ Ў ТРЫ РАЗЫ!

**Пра вынікі работы калектыву за сем месяцаў мы папрасілі расказаць начальніка планава-эканамічнага аддзела Мікалая САЛАНІНКІНА.**

— У завяршальным годзе пяцігодкі прадпрыемства паспяхова спраўляецца з даведзенымі асноўнымі мэтавымі паказчыкамі. Перавышаны тэмпы росту аб'ёмаў прамысловай вытворчасці ў супастаўных цэнах. За гэты перыяд выпушчана і пастаўлена ў гаспадаркі да пачатку жніва 166 збожжаўборачных камбайнаў, у тым ліку 85 — «Ліда-1300» (усе яны адпраўлены, у асноўным, у розныя рэгіёны Расіі) і 81— «Ліда-1600» (працуюць пераважным чынам у Гродзенскай вобласці і часткова ў Віцебскай). Да пачатку веснавых палявых работ у прадпрыемствы аграпрамысловага комплексу было адпраўлена амаль 300 глебаапрацоўчых пасяўных агрэгатаў чатырох відаў, выпушчаных сумесна з нямецкай фірмай «Лемкен», а таксама шмат іншай сельскагаспадарчай тэхнікі, патрэбнай земляробам. За гэты перыяд на суму каля трох мільярдаў рублёў выпусцілі запасных частак і цалкам задаволілі ўсе заяўкі гаспадарак па гэтай пазіцыі.



Прадукцыя на складах не залежваецца, фактычная яе наяўнасць значна ніжэй устаноўленага нарматыву. Тэмп росту экспарту да адпаведнага перыяду мінулага года — 146,7 працэнта. Наша тэхніка экспартуецца ва ўсе краіны СНД, краіны Балтыі, Польшчу, Чэхію, Сербію, Іран, нават у Венесуэлу.

Знешнегандлёвае сальда пакуль яшчэ адмоўнае, але распрацаваная намі праграма імпартазамяшчэння выконваецца даволі паспяхова, і імпарт скараціўся на 38 працэнтаў да адпаведнага перыяду мінулага года. Перавышана заданне па энергазберажэнні, паказчык па росце прадукцыйнасці працы склаў 111 працэнтаў. Па заданні ўрада мы павінны выйсці да канца года па зарплаце на 500 долараў. На гэты ўзровень ужо выйшлі: сярэдняя зарплата ў ліпені склала 2029,0 тысяч рублёў.

Нармальна складваюцца і паказчыкі за пяцігодку. Звярніце ўвагу: тэмпы росту аб'ёмаў вытворчасці ў супастаўных цэнах ўзраслі ў тры разы, і гэта — на існуючых плошчах і фактычна з тымі ж магутнасцямі. За кошт чаго забяспечаны такі прырост? У асноўным дзякуючы пастаноўцы на канвеер новай прадукцыі — у першую чаргу гамы глебаапрацоўчых пасяўных агрэгатаў і збожжаўборачных камбайнаў.

Усе гэтыя гады выконваўся і паказчык па энергазберажэнні. Так што акцыянернае таварыства крочыць у нагу з перадавымі калектывамі галіны.

Думаем пра перспектыву. На наступную пяцігодку (2011—2015 гады) прадпрыемства намячае сур'ёзныя змены на «маршы». Мы ўшчыльную падышлі да таго, што неабходна будаўніцтва новых цэхаў і патрэбна тэхнічнае пераўзбраенне. Сучаснае высокапрадукцыйнае абсталяванне дазволіць далей нарошчваць вытворчасць без павелічэння колькасці персаналу, за кошт росту прадукцыйнасці працы. Зараз распрацоўваецца стратэгічная праграма на новую пяцігодку, якая вызначыць асноўныя напрамкі далейшага развіцця.

**Публікацыю падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ і Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).**

УНП 590586728.



Ветэран вытворчасці Казімір ПАБЯДЗІНСКІ і малады слесар-інструментальшчык Аляксандр ЛЕСНІЧЭНКА.





Сучасны складаны станок з лічбавым праграмным кіраваннем даручаны аператару-наладчыку Аляксандру КАРНЕЕЎУ.



Інжынеры-канструктары Ігар ЯВАРОВІЧ, Дзмітрый МЯЦЕЛЬСКІ, Уладзімір СІМАНАЎ і Дзмітрый ГУТОЎСКІ. На здымку побач — новы бульбаўборачны камбайн.

# Аўтамабільная пробка ў Кітаі расцягнулася на 9 дзён і 100 км

**НА кітайскай аўтамагістралі Тыбет — Пекін утварылася гіганцкая аўтамабільная пробка працягласцю больш як 100 кіламетраў. Яна доўжыцца ўжо дзевяць дзён, паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на мясцовыя ўлады.**



Да ўзнікнення такога вялізнага аўтамабільнага затору прывялі дарожныя работы, якія праводзіліся на некаторых участках скараснай трасы, а таксама перагружанасць руху. Акрамя гэтага, стан пробкі ўскладняюць рэгулярныя аварыі і паломкі аўтамабіляў.

Вадзіцелі спадзяюцца, што дарожная сітуацыя палепшыцца ў верасні — пасля завяршэння рамонтных работ. Адзначаецца, што дарожнае палатно было разбурана з-за інтэнсіўнага грузавога руху. Цяпер аўтамабілісты забаўляюць сябе ў пробках гульнямі ў карты і шахматы. А мясцовыя жыхары, карыстаючыся сітуацыяй, арганізавалі дробны бізнэс, прадаючы вадзіцелям ежу і напіткі па шматразова завышаных цэнах. У той жа час узніклі масавыя перабоі паставак у Пекіне, дзе амаль 20 млн жыхароў чакаюць дастаўкі грузаў.

Сітуацыю па ўсёй працягласці затору кантралююць больш як 400 паліцэйскіх.

У 2010 годзе Пекін заняў другое месца ў спісе гарадоў з самай неспрыяльнай дарожнай сітуацыяй. Ён атрымаў 99 балаў са 100, уступіўшы толькі Мехіка. Пры гэтым амаль палова жыхароў кітайскай сталіцы лічаць, што апошнім часам сітуацыя на дарогах горада палепшылася.

## Усміхнемся!

— Кіроўца, выйдзіце з кабіны! Трэба праверыць вас на алкаголь.

— Выдатна! Хто б пярэчыў? Бліжэй за ўсё да нас рэстаран, але можна і ў піўную пайсці...




☺

**У нас сёння трагедыя... У нашым шматпавярховіку прарвала каналізацыю, якая заліла размеркавальны шчыт, з-за чаго выключылася святло. А ў гэты час у ліфце ехалі ліфцёр, сантэхнік і электрык...**

## ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

**Сканворд (20 жніўня). Па гарызанталі:** Герасіменя. Батат. Чака. Зубр. Трос. Алоэ. Станюта. Укус. Тот. Туф. Дражэ. Бархан. Пта. Рака. «Манас». Гранула. Покер. Тарантас. Шар. Ала. Маа. Паронім. Колас. Сапа. Крагі. Вараг. Ода. Куш. Мартынаў. **Па вертыкалі:** Абсяг. Шво. Бекар. Капа. Норма. Астапчук. Асілак. Унт. Лета. Геба. Амар. Сквош. Актэт. Хмара. Рытар. Паром. Ост. Пагада. Тост. Ігар. Арда. Аер. Раён. Юкатан. Тан. Каралі. Рыба. Эпас. Самсонаў.

## СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.05 | 20.17 | 14.12 |
| Віцебск — | 5.52 | 20.10 | 14.18 |
| Магілёў — | 5.55 | 20.07 | 14.12 |
| Гомель — | 5.55 | 20.00 | 14.05 |
| Гродна — | 6.20 | 20.32 | 14.12 |
| Брэст — | 6.25 | 20.29 | 14.04 |

**Месяц**

*Поўня 24 жніўня.*
*Месяц у сузор'і Рыбаў.*

**Імяніны**

***Пр.*** *Аляксандра, Аляксея, Вячаслава, Дзмітрыя, Івана, Пятра, Сяргея, Якава, Яфіма.*

***К.*** *Луізы, Людвіга, Рыгора, Юзафа.*



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.




## Дзве даты

### 25 жніўня

**1804 год —** у горадзе Свіслач адкрыта гімназія. Спачатку гэта была губернская навучальная ўстанова, а з 1834 года — павятовая. Уладальнік мястэчка граф В.Тышкевіч прадаставіў будынак і сродкі на яго рамонт, а таксама адпісаў Свіслацкай гімназіі 30 тысяч рублёў срэбрам. Гімназія мела 6 класаў. Выкладаліся польская, лацінская, грэчаская, нямецкая і французская мовы, арыфметыка, алгебра, геаметрыя, трыганаметрыя, фізіка, касмаграфія, хімія, мінералогія, гісторыя, міфалогія, прыродазнаўства, батаніка, сельская гаспадарка, садоўніцтва, землеўпарадкаванне, архітэктура, мараль, рыторыка, паэзія, эстэтыка, маляванне, музыка, гімнастыка. У 1825 годзе ў Свіслацкай гімназіі выкладаў Ян Чачот. Тут у 1847-52 гадах вучыўся Кастусь Каліноўскі. Навучальная ўстанова ліквідавана царскімі ўладамі ў 1865 годзе.



**1819 год —** на свет з'явіўся Алан Пінкертон, самы вядомы шпік. Ён быў сынам паліцэйскага сяржанта ў Глазга, вывучыўся на бондара, і ў 1842 годзе эміграваў у ЗША. Асеўшы ў мястэчку Дандзі непадалёк ад Чыкага, ён адкрыў там бандарную краму. Аднойчы ён сутыкнуўся з фальшываманетчыкамі, якіх пазней сам жа і схапіў. Пасля шэрагу падобных подзвігаў ён быў абраны ў 1846 годзе шэрыфам. Кінуўшы праз чатыры гады паліцэйскую службу, Пінкертон арганізаваў прыватнае дэтэктыўнае агенцтва, якое спецыялізавалася на чыгуначных крадзяжах. Яго агенцтва хутка набыло вядомасць, самымі буйнымі поспехамі былі прадухіленне замаху на прэзідэнта Лінкальна ў Балтыморы ў 1861 годзе і арышт арганізатараў крадзяжу 700 000 долараў у чыгуначнай кампаніі Adams Express. Агенцтва Пінкертона першым увяло ў практыку выкарыстанне фатаграфій і падрабязных апісанняў злачынцаў. Гэтыя звесткі распаўсюджваліся па гарадах ЗША, на людных месцах вывешваліся партрэты адшукваемых з абяцаннем узнагароды за дапамогу ў вышуку. Памёр дэтэктыў у 1884 годзе ад гангрэны пасля таго, як прыкусіў язык, спатыкнуўшыся на тратуары.

## Цытата дня:

*«Мужчыну цікавяць жанчыны з мінулым: ён спадзяецца, што гісторыя паўторыцца».*

**Мэй Уэст (1892—1980), амерыканская актрыса, тэатральны прадзюсар.**

## Рыштаванні Бацькаўшчыны

# ПА ВЕРЫ НАШАЙ...



*Нядаўна ў царкве з'явіўся новы абраз — прыхаджанка знайшла яго на гарышчы сваёй хаты і прынесла ў храм. Пачарнелы абраз з цягам часу стаў сам абнаўляцца, і ўжо сёння можна бачыць на ім самога Збавіцеля. На здымку: матушка Аксана з абразом.*









**УЖО шэсць стагоддзяў Сынкавіцкая царква-крэпасць Святога Архангела Міхаіла прыцягвае сюды, у вёску Зэльвенскага раёна Гродзенскай вобласці, як паломнікаў, так і турыстаў, і не толькі з нашай краіны. Царква, якая доўгія гады была зачыненая, сёння дзейнічае. Зачынілі Сынкавіцкую царкву ў 1920-я гады. Зрабілі ў ёй збожжасховішча, а амаль праз дарогу ад святыні размясціўся калгасны кароўнік, які стаіць, толькі разбураны, і зараз. Сёння царкву адраджаюць. Днямі тут усталявалі новы літы крыж, драўляныяківоты ручной работы. Знешняй рэканструкцыяй царквы займаюцца пастаянна — вось і цяпер там працуюць студэнты архітэктурнага факультэта**

ПАЛОМНІКІ едуць да абраза Багародзіцы, малітва перад якім дапамагае зацяжарыць і нават вылечвае анкалагічныя захворванні. Да абраза прымацавана вялікая колькасць розных упрыгажэнняў — гэта ад тых вернікаў, каму Маці Божая дапамагла. Днямі да Багародзіцы прыехала сорак пяць дзетак, хворых на анкалогію. На пытанне матушкі Аксаны, адкуль яны, хлопчыкі і дзяўчынкі адказалі: «Мы з Брэста. Мы — дзеці-смяротнікі. Нам засталося жыць два месяцы... тры месяцы...». І, молячыся, дзеці прасілі не здароўя. Яны казалі: «Мама Божая, дапамажы перанесці нам гэтую хваробу... ».

31 жніўня ў Сынкавічах — вялікае свята: а палове дзявятай раніцы сюды прыбудзе копія цудатворнага абраза «Усецарыца» з Афона (Грэцыя), асвячоная ў дваццаці манастырах Афона і прыкладзеная да мошчаў святых угоднікаў Божых. Службу ўзначаліць епіскап Гродзенскі і Ваўкавыскі Арцемій.

**Марына БЕГУНКОВА. Фота аўтара.**

*в. Сынкавічы, Гродзенская вобласць.*

## Ну і ну!

### ПАЖАРТАВАЎ?

А дзясятай гадзіне вечара жыхар вёскі Нядойка Буда-Кашалёўскага раёна ехаў на сваёй «капейцы» ўздоўж галоўнай вуліцы. Заўважыў, што на левай узбочыне на мапедзе сядзіць хлопец, а побач стаіць дзяўчына. Як расказалі ў прэс-службе ДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама, па словах 45-гадовага кіроўцы аўто, яму не спадабалася, што ў юнака на транспартным сродку была ўключаная фара, і ён вырашыў ці то спалохаць, ці то пажартаваць — праехаць як мага бліжэй да парачкі. У выніку ён зачапіў абодвух. 16-гадовы хлопец упаў, але моцна не пашкодзіўся, а вось дзяўчына з пераломамі трапіла ў бальніцу. Да таго ж кіроўца знік з месца злачынства. Яго па гарачых слядах вылічылі супрацоўнікі падраздзялення ДАІ «Маланка», якія хутка правялі расследаванне. Пры затрыманні грамадзянін быў яўна ў стане алкагольнага ап'янення, але толькі экспертыза пакажа, ці то ён заліў свой жах пасля здарэння, ці то здзейсніў наезд нецвярозым.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### АДКУЛЬ, БАБУЛЬКА, СТОЛЬКІ ТЫТУНЮ?

На чыгуначнай станцыі ў вёсцы Асінаўка Дубровенскага раёна супрацоўнікі Аршанскага аддзела ўнутраных спраў на транспарце затрымалі 66-гадовую пенсіянерку, жыхарку Мінска, у якой пры сабе было 1760 пачкаў цыгарэт. На пачках з тытунёвымі вырабамі імпартнай вытворчасці адсутнічалі акцызныя маркі Рэспублікі Беларусь. Адкуль у паважанай бабулі столькі цыгарэт, што яна хацела зрабіць з такой буйной партыяй, абавязкова высветляць.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### ЗАТРЫМАНА ПАРТЫЯ КАНТРАБАНДНЫХ ЦЫГАРЭТ НА Br30 МЛН.

Партыю цыгарэт агульным коштам Br30 млн. спрабаваў незаконна вывезці ў Літву грамадзянін Польшчы. Смаргонскія пагранічнікі сумесна з супрацоўнікамі мытні ў пункце пропуску «Каменны Лог» затрымалі грузавы аўтамабіль Scania, які рухаўся на выезд у Літву. Пасля ўважлівага агляду ў паўпрычэпе машыны было знойдзена двайное дно. У яго вадзіцель схаваў каля 12 тыс. пачкаў цыгарэт.

Тытунёвая кантрабанда канфіскавана. Да рашэння суда затрыманы таксама і аўтамабіль, ацэнены ў Br90 млн. У сувязі з наяўнымі прыкметамі правапарушэння пачаты адміністрацыйны працэс.

**БЕЛТА.**

## КАБ БЫЦЬ ШЧАСЛІВАЙ У ШЛЮБЕ

У абрадзе провадаў нявесты з хаты бацькоў было шмат рытуальных дзеянняў, якія насілі, здавалася б, утылітарна-практычны характар, але былі зарыентаваныя на далёкую жыццёвую перспектыву.

- Напрыклад, пры адпраўленні пад вянец нявеста павінна была дакрануцца да печы — «сагрэць» рукі: калі печ была цёплай, свякруха будзе добрай.
- Каб быць шчаслівай у шлюбе, парог роднай хаты трэба было пераступіць правай нагой.
- Для больш хуткага замужжа сяброўак нявеста кідала клубок з ніткамі і казала: «Каціцеся, дзеўкі, усе за мною!».
- Каб у маладых нарадзіліся дзеці, нявеста станавілася на кола і загадвала: колькі спіц у коле, столькі дзяцей за мужам.
- Як толькі вясельны поезд ад'язджаў ад двара, маці нявесты хутка пералічвала ўсіх тых, хто ў гэты момант знаходзіўся ў двары. Калі колькасць людзей была цотнай, гэта абяцала дабрабыт дачкі ў шлюбе, калі няцотнай — дачка стане ўдавой.
- Перш чым зайсці ў храм, маладыя павінны былі пачаставаць усіх сустрэтых на шляху людзей, дзяцей, жабракоў і г. д. печывам, пірагамі і іншымі прысмакамі. Лічылася, чым больш пачастункаў будзе раздадзена, тым багацей будзе жыццё маладых.
- У той жа час у народзе ведалі, што раздаваць пачастункі, міласціну, выйшаўшы з храма, катэгарычна забаранялася.
- У гэты момант прасілі званіць у званы, каб звон разлятаўся па ўсёй акрузе, абвяшчаючы пра шлюб маладых людзей.
- Каб быць неразлучнымі, маладыя павінны былі пераступіць царкоўны парог разам.
- Яркае полымя царкоўных свечак пры вянчанні прадказвала маладым добрае, шчаслівае жыццё; спакойнае, ціхае полымя — дружнае, але кароткае жыццё; калі падчас вянчання свечкі маладых моцна трашчалі, меркавалі, што жыццё ў іх будзе вельмі неспакойным.
- Лічылася, калі ў кагосьці з маладых падчас вянчання згасне свечка, той пройдзе карацейшы жыццёвы шлях.
- Неабходна адначасова задзьмуць царкоўныя свечкі, каб «жыць разам і памерці разам».
- Маладыя ў момант шлюбу павінны былі стаяць на ручніку. Пад ручнік маглі пакласці некалькі залатых або медных манет, чырвоны пояс-абярэг і іншыя сімвалічныя рэчы. Усе яны павінны былі стварыць спрыяльныя ўмовы для жыцця маладых.
- Ручнік, на якім маладыя стаялі падчас вянчання, павінны былі тут жа згарнуць сваты або хросныя бацькі, каб ніхто не тое што не наступіў на яго, але нават і не даткнуўся (каб па жыцці ніхто жонку «не лапаў»).

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

Сардэчна віншую з юбілейным днём нараджэння паважаную **Таццяну Васільеўну КАРАЛЕНКУ** з Мінска.

Жадаю жыццёвай радасці ад добрага здароўя, сяброўскай прыязнасці, сямейнай утульнасці, аптымізму, кахання. Няхай атуляюць цябе прыемнае святло сонечных дзён, цеплыня блізкіх людзей, няхай спадарожнічае табе ўдача.

**Валянціна,** *г. Мінск.*

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

**Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.**

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.**

**Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 4134 Нумар падпісаны ў 19.30.**

**М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**
**П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**